Працэс адзінаццаці ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

ВЕРА АНДРАЙЧУК ☞ 11

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 9 (2598) Год LI Беласток, 26 лютага 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Праваслаўны асяродак міласэрнасці „Элеас" знаходзіцца ў будынку былой школы. Заснавалі яго ў 2001 годзе, бо не было перспектыў аднавіць школу. У цэлай парафіі асталося ўсяго 268 душ...

Пражыць адзін дзень

— А можа *андуляцыю* якую хочаце?, — вітае мяне ў парозе матушка Тамара Ахрымюк з Трасцянкі.

Я другі раз у тутэйшым Доме для састарэлых, адтуль і такое свойскае прывітанне. Сёння наведала іх цырульніца з Нарвы. На крэслах ля сцяны, быццам у сапраўдным салоне, выседжваюць жанчыны з сярэбранымі лісткамі на галаве. Пасля на валасах атрымаюцца т.зв. „пасэмка". Жыхаркі асяродка, асабліва тыя малодшыя, дбаюць пра свой выгляд. У адной падмаляваныя вусны. Не дзіва, мужчын тут як на лякарства — на 21 кабету іх толькі пяць.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Праваслаўны асяродак міласэрнасці „Элеас" знаходзіцца ў будынку былой школы. Заснавалі яго ў 2001 годзе, бо не было перспектыў аднавіць школу. У цэлай парафіі асталося ўсяго 268 душ.

— Няма ўжо ў нас вяселляў, няма хрысцін. Адны *погжэбы і погжэбы* ў вёсцы. Як мы тут 14 гадоў на парафіі, — прыгадвае матушка, — то больш за 200 чалавек пайшло ўжо на той свет.

Лідзія, год нараджэння 1922, ад пачатку ў асяродку. Бабуля — аўтарытэт сярод грамады. Заўсёды, калі прыязджаюць сюды з выступленнямі і песнямі, просяць яе, каб ад імя ўсіх слова сказала. Сама бабуля ахвотна апавядае пра свае зацікаўленні. З ходу чытае мне з памяці апавяданне Дзядзькі Кваса. Яно пра добрую маці-сялянку і гарадскога сынка, які націскае старую, каб тая ўсё прадала і аддала яму грошыкі. Баба Лідзія добрая акцёрка. Калі дэкламуе апавяданне, ёй падтакваюць сяброўкі.

— Праўда, праўда! — ківаюць галовамі, — ісцінна праўда!

У многіх старэч асталася крыўда да родных за тое, што адправілі іх у дом для састарэлых.

— Ёсць такія людзі, якія паміраюць ад жалю, — кажа матушка. — Пажыве месяц-два і ўсё, канец! Не вытрымоўвае расстання. Учора таксама адправілі бабулю, бо ад пачатку не магла знайсці сабе месца ў асяродку. У канцы перастала гаварыць, пасля есці...

— Тэлефаную я да дачкі і прашу каб забіралі, бо, вядома, як гэта ўсё скончыцца. — Матушка Тамара ўжо звыклася з прагматызмам сучасных дочак і сыноў.

— Цяпер старыя нікому непатрэбныя.

Лідзія, — як сама кажа, — прыйшла ў Трасцянку *радзі* царквы і па сваёй волі. Праз пяцьдзесят гадоў, нядзелька ў нядзельку, чытала „Апостала" і „Часы" ў сваёй царкве.

— А цяпер захварэла і няма сілы, каб у царкву дабрацца, — наракае, — а ў бібліятэчцы, якая тут вельмі сціплая, прачытала ўжо двойчы ўсе кніжкі. Бабуля, на маё жаданне, апавядае пра сям'ю, пра дзевяць унукаў і адну праўнучку. Няма ў іх часу прыехаць у Трасцянку. Часам дачка загляне, хоць і ў тае не заўсёды на білет хапае:

— Нічога я ад іх не патрабую, — кажа сумна, — бо ніц я ім не дала!

Цяжкавата апісаць адзін звычайны дзень у асяродку, хоць на першы погляд жыццё тут падаецца манатонным і нерухомым.

— Няма ў нас нечага такога як „пабудка", — паясняе матушка, — людзі ўстаюць хто ў чатыры, хто ў пяць гадзін. Да снедання, якое ў нас у 8.30 у доме ўжо рух, людзі шпацыруюць па калідоры, чакаюць назначанай пары. Пасля, аж да абеду, значыць да 12 гадзіны, сядзяць ля тэлевізара. Гэта наогул дзелавы ды бурлівы час. На калідоры гоман, часам узнікаюць... спрэчкі. У 12.00 усе ўжо ў сталовай.

— Тут нельга спазніцца з абедам, — талкуе мая субяседніца, — усё мусіць быць мінута ў мінуту. Інакш людзі нервуюцца, выбіваюцца з рытму руціны.

Пасля абеду прыходзіць час на так званае „лежакаванне". Праўда, не ўсе могуць вылежаць у белы дзень у ложку. Заўсёды да падвячорка, які ў нас у 15 гадзін, ёсць нейкія справы. Ці гэта лекар прыедзе, ці, як сёння, — цырульніца.

— А ў 18.00, пасля вячэры, многія ідуць ужо спаць, — чую пра заканчэнне дня.

— Ці арганізуеце ім нейкую працу?

— Вось бачыце, — матушка ўспамінае пра агарод, які арганізавалі спецыяльна бабулькам, — людзі не хочуць працаваць. Кажуць, што гэта ім чужое поле. Адна толькі ахвотна там корпаецца, даглядае.

У асяродку працаўнікі ўсе з навакольных вёсак і Нарвы, тут дзве кухаркі, дзве прыбіральшчыцы, даязджае медсястра і лекар. Большасць падапечных — людзі нямоглыя, хворыя.

— А ці прымаеце ўсіх ахвотных-хворых?

— Ёсць праблемы, калі яны занадта агрэсіўныя. Быў у нас адзін шызафрэнік. Мы з дапамогай паліцыі былі вымушаны адвезці яго ў Харошчу. Кідаўся ў бойку, калі што не па яго мыслі было.

Каб папасці ў дом для састарэлых трэба, згодна з дамовай, пакінуць там 75 працэнтаў сваёй пенсіі. Прынцыпова трэба мець пенсію не меншую за шэсцьсот злотых.

— А калі ў каго якая *канцоўка* астаецца, — чую ад працаўнікоў, — сям'я яшчэ ў той самы дзень прыязджае па грошы.

Самі жыхары дома абыякавыя ўжо для сваіх патрэб, многія ставяць крокі з дапамогай каляскі. Пра свой тут побыт кажуць:

— Дзень пражыў — то і слава Богу!

Ганна Кандрацюк

Зарэгістравалі ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

На гэты раз абышлося без сенсацый. Усе чацвёра прэтэндэнтаў на вышэйшую дзяржаўную пасаду — Аляксандр Лукашэнка, Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін і Сяргей Гайдукевіч — былі зарэгістраваны Цэнтральным выбарчым камітэтам. У дзень рэгістрацыі ўсе кандыдаты першы і апошні раз сустрэліся разам...

Сістэма абсурду? ☞ 3

3. Рамашэўскі: Падобныя абвінавачанні можна паставіць сотням асоб дзейнічаючым на тэрыторыі ўсяе краіны... І чамусьці такія справы не ўзбуджаюцца. Тут па нейкай прычыне гэту справу зачапілі. Для мяне гэта перш за ўсё справа шырокага сістэмнага абсурду. Нявыключана, аднак, што паявіліся тут нейкія непаразуменні на нацыянальным грунце...

Саламяны свет ☞ 4

Аляксей Мароз

Уладзімір Цэтра з Кашалёў саломапляценнем пачаў займацца, будучы яшчэ маладым хлопцам. Выплятаў ён каробкі, калі масава рабілі іх аднавяскоўцы і жыхары суседніх сёлаў, прадаючы вырабы з саломы за прыстойную цану. Зараз прыбытак ад продажу саламяных талерак, куфраў, збанкоў, ці шлёпанцаў — невялікі...

Інструктар БГКТ ☞ 5

Уладзімір Сідарук

У 1959 годзе выпала мне на долю быць штатным працаўніком Таварыства на пасадзе культурна-асветнага інструктара ў Гайнаўскім аддзеле БГКТ. Заступіў я Лявона Майсеюка, які адышоў працаваць на радыё. Наш аддзел змяшчаўся тады ў будынку па вуліцы Мар'яна Бучка, разам з іншымі маладзёжнымі арганізацыямі...

Сямятыцкія гурткі ☞ 10

М. Вішанка: Спачатку стварылі ініцыятыўную групу, наладзілі сход. Прыехалі Сакрат Яновіч і Янка Вішанка. Яновіч сказаў прамову і наша група рашыла арганізаваць па вёсках гурткі таварыства. Прыслалі нам з ГП машыну і мы — Васіль Леанчук з Машчонай-Панскай, Анатоль Мартыновіч, загадчык школы ў Вульцы-Нурэцкай, сам родам з Орлі ды Сяргей Крэйза з Мілейчыч — узяліся за справу...

Віншуем
Беларускае грамадска-культурнае таварыства
з юбілеем 50-годдзя.
Рэдакцыя „Нівы"

9 770546 196000

Хто за Бацьку, хто за Бацькаўшчыну

17 лютага адбылася рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. На гэты раз абышлося без сенсацый. Усе чацвёра прэтэндэнтаў на вышэйшую дзяржаўную пасаду — Аляксандр Лукашэнка, Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін і Сяргей Гайдукевіч — былі зарэгістраваны Цэнтральным выбарчым камітэтам. У дзень рэгістрацыі ўсе кандыдаты першы і апошні раз сустрэліся разам. Кожны атрымаў колькі хвілінаў на прамову. Тэлебачанне самае цікавае, канечне, не паказала. На публічныя тэлебаты і спадзявацца марна. Апошні раз такія дыскусіі па важнейшых пытаннях развіцця краіны Беларусь бачыла ў 1994 годзе. Пасля гэтага толькі маналогі, тэатр аднаго актора на фоне статыстаў-лакеяў.

Месяц будзе доўжыцца агітацыя. На тэлебачанні кожнаму кандыдату далі толькі два выступы па паўгадзіны. І тыя не ў простым эфіры, а ў запісе. Між тым, агітацыя за пажыццёвага першага прэзідэнта доўжыцца ўжо дванаццаты год. БТ даўно можа падаваць заяўку ў кнігу рэкордаў Гінэса адразу ў дзвюх намінацыях — па колькасці разоў і агульнай працягласці з'яўлення адной асобы на тэлеканале. Зараз на экраны выдаецца рэклама пад лозунгам „За Бацьку!".

У цяперашняй выбарчай кампаніі ніякай цікавасці не выклікае толькі штучная кандыдатура Гайдукевіча, які цалкам з'яўляецца праваднікам сённяшняй палітыкі і пакліканы для масоўкі і ўяўнай знешняй альтэрнатыўнасці. Што датычыць трох Аляксандраў, то тут намнога цікавей.

Пра Аляксандра Лукашэнку напісана ўжо так шмат, што нічога новага не скажаш. Зразумела, што ён — закладнік сваёй палітыкі, з курсу якой не збочыць ні на паўкроку. Сістэма, створаная пад яго кіраваннем, не спыніцца на паўдарозе. Палітычны ідэал гэтай сістэмы — таталітарны СССР з суб'ектамі-марыянеткамі і лялькаводамі ў Крамлі. Нездарма ў масавай свядомасці культывуецца так званая Саюзная дзяржава, куды па вушы ўцягнулі нашу няшчасную Беларусь.

Аляксандр Казулін — фігура ў беларускай палітыцы нядаўняя і знакавая. Менавіта так, з невядомасці і „ніадкуль", вылупіўся калісьці Лукашэнка, якога многія не ўспрымалі сур'ёзна. Без сумніву Казулін — гэта доўгатэрміновы праект. Пра гэта найпрасцей было даведацца ад самога... Казуліна, што называецца з першых вуснаў. Гэты неафіт-сацыял-дэмакрат наўпрост заявіў, што зробіць усё, каб не дапусціць зараз у краіне рэвалюцыйных зменаў. Паведаміў таксама, што збіраецца дакладна перамагчы на наступных прэзідэнцкіх выбарах. Тыя людзі, што з прагматычных меркаванняў пайшлі працаваць у яго каманду, цудоўна разумеюць (бо дурных у палітыцы няма, усе дурныя на сваю карысць!), што такая постаць як Казулін ніяк не можа быць гарантам незалежнасці Беларусі. Але ж пайшлі, паляцелі па першым поклічы, і Бог ім, як кажуць, арбітр.

Аляксандр Мілінкевіч — вылучэнец аб'яднанай кааліцыі апазіцыйных сіл „5 плюс", якая разраслася, але не зрабілася такой маналітнай і моцнай сілай, як планавалі стваральнікі. Тым не менш адно з апошніх сацыялагічных апытанняў цвердзіць, што рэйтынг папулярнасці Мілінкевіча ў такіх гарадах як Гродна і Мінск складае 39,6 адсотка. Паводле тых жа даследаванняў фактычна такая самая падтрымка і ў Лукашэнкі. У кааліцыі працуе досыць шмат людзей, якія будуць актыўна, старанна займацца агітацыяй і назіраннем. Аднак, дабіцца сапраўдных лічбаў па выніках галасавання не ўдасца. Змены магчымыя толькі тады, калі штаб Мілінкевіча не будзе ў выбарчай кампаніі працаваць па схеме ўлады, якая не дае аніякіх шанцаў. Патрэбныя нестандартныя захады і метады. Такой альтэрнатывай можа стаць сістэма народнага галасавання, якую настойліва прапануе Зянон Пазьняк са сваёй камандай. Аб'яднаўшы сілы, гэты мірны сцэнарый змены ўлады здзейсніць рэальна. Усе, хто змагаецца за незалежную і дэмакратычную Бацькаўшчыну, мусяць думаць як паразумецца. Часу засталося няшмат.

Уладзімір Хільмановіч

Абраза пачуццяў вернікаў Магамета

На свеце цэлы час нешта дзеецца — або Памэла Андэрсан разводзіцца з мужам, або да яго вяртаецца. Здараюцца і іншыя падзеі, якія выклікаюць зацікаўленне менш ці больш шырокай публікі. Апошнім часам перадавыя артыкулы мас-медыяў захапіў закалот вакол прарока Магамета, а дакладней — вакол ягоных выяўленняў. Накал эмоцый у ягоных паклоннікаў, якія абвінавачваюць датчан і іншыя нацыі ў абразе іх рэлігійных пачуццяў, выліўся ў даволі пагрозлівыя падзеі.

Даведнікі інфармуюць, што Магамет прапаведаванай ім рэлігіі даў названне ісламу, а слова гэтае абазначае пакорлівасць. Вядома, што іслам шмат што прыняў з хрысціянства; магчыма, што і яго назва была навеяна з гэтага напрамку. Гэта было даўно, а вось у апошні час у ісламскім свеце бачны рост ваяўнічасці. Вынікі апошніх выбараў у Палесціне, а асабліва ў Іране, паказваюць, што іранская рэвалюцыя аяталы Хамейні і падобныя ёй падзеі на Блізкім Усходзе паспрыялі выхаванню сучасных янычараў, гатовых стаць гарматнім мясам на палітычным стале. У такім ракурсе Прарок патрэбны для прыкрыцця іншага зместу.

Супраць апублікавання ў польскай прэсе выяваў Магамета горача запратэставалі нашы хлопцы, тутэйшыя мусульмане, патрабуючы пакорлівага каяння апальных рэдактараў. Год ці два таму ў нашай краіне была выпушчана кніга індыйскага пісьменніка Сальмана Рушдзі; тутэйшыя цяперашнія вартавыя рэлігійных пачуццяў тады гэтага не заўважылі, а тая, крытычная ў адносінах да ісламу, кніга ў свой час выклікала ў свеце хіба не меншыя эмоцыі чым цяперашнія. Не трэба гэтаму занадта дзівавацца; цяпер народ чытае галоўным чынам таблоіды, дзе малюнкаў многа, а тэксту мала.

Абраза рэлігійных пачуццяў становіцца выгаднай эмацыянальнай адмычкай, якою лягчэй карыстацца чым лагічнымі аргументамі. Не так даўно ў нашай Польшчы пад абстрэл трапіла карціна Дароты Нязнальскай, якая ў алегарычным відзе паказала частку нашага публічнага жыцця, дзе мясцовая рэлігія скарыстоўваецца ў якасці фігавага лістка. Той фігавы лісток на карціне поўнасцю празрысты і гэтага хапіла: героі алегорыі паднялі вэрхал пра абразу рэлігійных пачуццяў, каб заглушыць сапраўдны сэнс карціны; у выніку таго вэрхалу аўтарку валочаць па лавах падсудных.

У нашым рэлятыўным сацыяльным клімаце не заўважаецца абразы рэлігійных пачуццяў нашых язычніцкіх продкаў. У час хрышчэння Кіева ў 988 годзе па загадзе князя Уладзіміра былі пасечаны і спалены статуі ўсіх язычніцкіх багоў, а галоўнага ідала, Перуна, звязалі пастронкамі і так цягалі яго па вуліцы і білі дубінамі, пакуль не ўтапілі ў Дняпры. Аж страх падумаць, як да падобнага ўчынку аднесліся б сённяшнія паклоннікі князя Уладзіміра, і не толькі яго.

Гонарам беластоцкага храмабудавання з'яўляецца царква Святога Духа, найбольшая ў горадзе. На яе абшырных сценах столькі месца для фрэскаў, што, мабыць, не хапіла б для іх святых. Мо таму на кожным з чатырох падкупальных ветразяў красуюцца вялікія выявы Хрыста. Чатыры абліччы Збавіцеля сузіраюць верную паству.

У стараславянскім пантэоне вялікае пакланенне адводзілася богу Святавіту з чатырма абліччамі. Найбольш вядомае месца яго культу было на Арконе, паўночным мысе нямецкай сёння выспы Ругія. У 1168 годзе дацкі кароль Вальдэмар здабыў Аркону, а статую Святавіта загадаў зваліць, прывязаць пастронак да яе шыі і завалачы ў агонь.

Датчане сёлета чарговы раз вызначыліся святаборствам усходняга і хіба пара іх пасадзіць на калектыўную лаву падсудных. На пакорлівым Блізкім Усходзе збіраюцца байкатаваць дацкія сыры, якіх у нас не прадаюць. Замест байкоту прадукцыі дацкіх мужыкоў мо варта пакорлівай тутэйшасці хаця перастаць чытаць казкі Ганса Хрысціяна Андэрсена.

Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма еўрапейца

Кантакты

Як штогод у першых яго тыднях польскі міністр замежных спраў прадставіў Сейму інфармацыю на тэму сёлетняй замежнай палітыкі. У гэты раз цяперашні шэф МЗС Стэфан Меллер засяродзіўся на ўдзеле Польшчы ў еўрапейскіх і сусветных структурах, сярод гэтага на мэтах, якія гэтым шляхам хацеў бы дасягнуць. Не забыўся аднак на ўсходнюю палітыку, у якой Польшча хоча іграць ролю своеасаблівага паказальніка ў ЕС. Прытым прадвесці наконт гэтага матыву замежнай палітыкі прагучалі зараз пасля кароткага абмеркавання супрацоўніцтва з Нямеччынай і Францыяй ды іншымі дзяржавамі Заходняй Еўропы, з пералічэннем Вялікабрытаніі, Іспаніі ды Італіі. Магло б гэта значыць, што польская замежная палітыка ў адносінах да некаторых усходніх еўрапейскіх краін будзе раўнаважная той, якая вядзецца ў адносінах да моцных дзяржаў Заходняй Еўропы. Міністр Меллер успомніў аб Беларусі пасля абмеркавання планаў звязаных з адносінамі з Расіяй (маюць быць „нармальныя, партнёрскія, чэрпаючыя з праваераных сфер супрацоўніцтва") ды Украінай.

Аб рэляцыях з Беларуссю казаў:

— Нашы адносіны з Беларуссю будуць залежаць ад развіцця сітуацыі ўнутры тае краіны, ад таго, наколькі пануючы там рэжым з выразна недэмакратычным абліччам далей будзе парушаць правы чалавека і грамадзяніна. Пробай развіцця тае сітуацыі будуць найбліжэйшыя прэзідэнцкія выбары. Жадаем каб перамагло ў іх тое, што ў Беларусі з'яўляецца грамадзянскім і дэмакратычным.

Асцерагаў, аднак:

— Апасаемся, аднак, што гэтым выбарам будзе спадарожічаць вядомы лозунг Сталіна, што няважна, хто як галасуе; важна, хто лічыць галасы. Калі б гэта мела здзейсніцца, дык тым цяжэйшым будзе вяртанне да паўнавартасных палітычных стасункаў паміж Беларуссю і Польшчай, асабліва на найвышэйшым узроўні. Адначасова будзем старацца ўтрымліваць абгрунтаваныя прагматычнай патрэбай міжведамасныя кантакты, эканамічнае, культурнае, юрыдычнае і грамадскае супрацоўніцтва.

Падкрэсліў:

— Мы гэтага хочам.

Міністр Меллер не скрываў, што Польшча перш за ўсё будзе надалей падтрымліваць — як гэта назваў — дэмакратычныя і грамадскія сілы ў Беларусі, ствараючы ім „лепшыя магчымасці доступу да інфармацыі". Мае гэтаму служыць вяшчаючая на Беларусь радыёстанцыя.

Тут трэба дадаць, што стараннi Польшчы, падтрымліваючыя беларускую адкрытую дзяржаву і дэмакратычныя сілы ў гэтай краіне, маюць падтрымку (мабыць, не толькі дэкларатыўную) таксама адміністрацыі ЗША. Гэтак заявіў прэзідэнт РП Лех Качынскі пасля візіту ў Вашынгтоне і сустрэчы з прэзідэнтам Джорджам Бушам.

Тым часам, зараз пасля выступлення міністра Меллера ў Сейме і вяртанні са ЗША прэзідэнта Качынскага разышлася ў СМІ вестка, што новым паслом Польшчы ў Мінску стане Генрык Літвін, прафесійны дыпламат, віцэ-дырэктар дэпартамента ўсходняй палітыкі МЗС, раней дарадчык пасольства РП у Маскве (дзе Стэфан Меллер быў паслом) і консул у Львове. Папярэдні пасол Тадэвуш Паўляк быў адкліканы міністрам Меллерам, як гаварылася, за „спрыянне рэжыму коштам кантактаў з апазіцыяй". Надзеі з новым польскім паслом мае беларуская апазіцыя. У адным з інтэрв'ю шэф Беларускага народнага фронту сказаў:

— Дзякуючы гэтаму Польшча будзе мець больш кантакт з беларускім грамадствам і лепшае разведанне таго, што ў нас адбываецца.

Нявыключана, што Генрык Літвін „з'едзе" ў Мінск яшчэ да прэзідэнцкіх выбараў 19 сакавіка.

Мацей Халадоўскі

Працэс адзінаццаці — палата № 6

У Дзень закаханых, дакладна на адну хвіліну да вызначанай гадзіны папрасілі ў залу нумар шэсць беластоцкага Раённага суда адзінаццацёра абвінавачаных, звязаных з былой Праграмнай радай „Нівы". Такая пунктуальнасць у судах рэдкасць, беручы пад увагу тое, што на вакандзе справа тыднёвіка не была першай у гэты дзень. Так вось поўным ходам пачаўся працэс былога шэфа Праграмнай рады, галоўнага бухгалтара і дзевяці іншых членаў рады тыднёвіка, якія незалежна ад прапановы пракуратуры аб спыненні справы ў адносінах да іх, самі хочуць ачысціцца ад абвінавачанняў.

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Яцак Сянкевіч (чарговы пракурор, які займаецца справай „Нівы") з пракуратуры Беласток-Поўдзень ледзь не паўгадзіны прадстаўляў акт абвінавачання. З кожнай хвілінай усё цішэй. Адзін з абвінавачаных Юры К. устаў і папрасіў, каб адчытваў ён абвінавачанні гучней і больш разборліва.

— Зразумела, — прагучала з боку пракурора.

У судах у падобнай сітуацыі абвінавачанага да голасу на яго просьбу дапускае (або і не) старшыня судзейскага складу. У гэты раз так не было. Суддзя Кшыштаф Казлоўскі быццам бы недачуў і не заўважыў просьбы Юрыя К.

Раней аднак пракурор пачаў ад пералічвання абвінавачанняў і параграфаў, пад якія яны падходзяць, наконт былога шэфа Праграмнай рады Яўгена М. Пачаў ад абвінавачанняў у „вядзенні рахункаводства насуперак правілам закону аб рахункаводстве, падаванне несумленных даных, а дакладна шляхам неадпаведнага кваліфікавання коштаў і прыбыткаў у справаздачных перыядах, нехраналагічнае вядзенне рахункаводчых кніг, адсутнасць дакументацыі апісваючай прынятыя прынцыпы рахункаводства..." Падобныя абвінавачанні прагучалі таксама ў адносінах да галоўнага бухгалтара Марыі П., а некаторыя з іх — лягчэйшага калібру („дапушчэнне падавання несумленных даных") у адносінах да апошніх. Двойцы галоўных абвінавачаных пракуратура паставіла галоўныя абвінавачанні, якія датычаць несумленнасці ў вядзенні рахункаводства ў 2001-2002 гадах і фальшаванне інфармацый у заявах на датацыі, сярод гэтага падаванне завысокіх інфармацый аб тыражу.

Яўген Мірановіч выступіў з заявай: „Ні адзін грош з публічных датацый не быў выкарыстаны на мэты іншыя, чым статутныя. Ні адна залатоўка не была змарнаваная ні прысабечаная (...). Заплатай за грамадскую дзейнасць былі прыніжаючыя допыты, бранне адбіткаў пальцаў, наезды паліцыі на кватэры, распазнавальныя здымкі ў газетах з чорным паяском на вачах і лавіна зневажальнай лухты распаўсюджванай пры любой нагодзе. (...) Ніколі не было ніякай сувязі паміж паказанай у заяве колькасцю тыражу і колькасцю прададзеных экземпляраў а сумай прызначаных Міністэрствам культуры датацый", — пачулі людна сабраныя ў зале журналісты, сярод іх незалежнай прэсы з Беларусі ды верныя чытачы „Нівы".

Бухгалтарка Марыя П. прызналася да ўчынення некаторых памылак, але не да віны. Сказала м.інш.:

— Я не прысабечыла грошай.

— Рахункаводства было адпаведнае патрэбам нашым і такога як мы згуртавання.

— У агульных справаздачах я зрабіла некалькі памылак, бо раней я рабіла нататкі і некаторыя магла памылкова расчытаць.

— Міністэрства пасля назначэння датацыі не патрабавала карэктур.

Дзевятка апошніх абвінавачаных таксама не прызнала сябе віноўнымі, не давала дэталёвых тлумачэнняў і не адказвала на пытанні.

— Мае веды зводзіліся да ведання, што бухгалтарка называецца Марыя, — дадаў адзін з іх.

— Я не разумею пастаўленых мне абвінавачанняў, — адзначыў другі.

— Маем давер да спадарыні Марыі П., — з націскам сказала чарговая абвінавачаная.

Праз паўтары гадзіны суд вызначыў чарговы тэрмін разбору. 10 сакавіка будуць дапытваць шасцёра сведкаў, сярод іх кантралёра НКП Роберта Скварку, якога заключэнні давялі да накіравання справы „Нівы" ў пракуратуру.

Разбору ўважліва прыслухоўваўся старшыня сенацкай Камісіі па правах чалавека і законнасці Збігневу Рамашэўскі. Тым часам, згодна з заявай віцэ-старшыні ПіС Адама Ліпінскага, ці следства супраць членаў рады „Нівы" вялося правільна, мае праверыць урад:

— Калі пацвердзіцца, што паявіліся нейкія няправільнасці, будуць паслядоўнасці, — заявіў віцэ-старшыня ў размове з газетай „Rzeczpospolita". Як можна было спадзявацца, каментарыі ў справе разбору паявіліся таксама і ў пралукашэнкаўскім беларускім друку. „Советская Белоруссия" цынічна інфармавала: „В общем, странно всё это. Особенно в свете обвинений, которые раздаются из Варшавы: мол, Минск притесняет польское меншинство. Ничего из вышеперечисленного в Беларуси не наблюдается и в помине".

Раіна Стэфанчук

Абвінавачаная: юрыдычная сістэма

Размова з сенатарам Збігневам РАМАШЭЎСКІМ (ПіС), старшынёй сенацкай Камісіі па правах чалавека і законнасці.

— Што Вы думаеце аб распачатым працэсе ў г.зв. „справе «Нівы»"?

— Я тут таму, што нейкім чынам адчуваю сябе абвінавачаным. У сапраўднасці абвінавачаная тут юрыдычная сістэма III РП. Гэтыя людзі не зрабілі нічога такога, што магло б прынесці якую-небудзь абразу іхняга гонару. Так збудаваная сістэма, праз якую можа прабіцца справа FOZZ, а звычайная ўстанова не можа прабіцца з людзьмі грамадска ангажаванымі. Гэтыя правілы проста скандальныя. Іх неабходна змяніць. Усе абвінавачанні ў сапраўднасці датычаць толькі парушэнняў у рахункаводстве. Калі б мы любую грамадскую дзейнасць мелі б пачынаць з рахункаводства, дык гэтая краіна ніколі не зварухнецца. Увогуле не будзе тут ніякай дзейнасці, ніякага адкрытага грамадства. Давайце перастанем сабе гэтым тлуміць галаву, бо закон аб рахункаводстве прыдушыць дзейнасць людзей, у якіх няма аграмадных грошай, дзе ў першую чаргу трэба мець бухгалтара, вось, кваліфікаванага бухгалтара, нават калі трэба сарганізаваць толькі дзіцячы лагер. Маем тут дачыненне з абсурдам, татальным недаразуменнем. У такі самы спосаб, паводле таго самага закону, дзейнічаюць вялікія ўстановы, якія карыстаюцца мільёнамі, нават мільярдамі злотых, і тыя невялікія, арганізуючыя летнікі для моладзі. Датацыі, якія прыходзяць з дзяржаўнага бюджэту ў верасні, каб іх выкарыстаць да 31 кастрычніка, на выдаванне, напрыклад, месячніка? Гэта так, быццам бы ў лістападзе і снежні той месячнік не выдаваўся. Чаму якраз да 31 кастрычніка? Бо гэтак выгадна бюракратычным установам. Маем тут дачыненне з прыкладам або татальнай бязглуздзіцы, або выпадкам злой волі. Гэта не можа так функцыянаваць.

— Ці дзеянні Найвышэйшай кантрольнай палаты і пракуратуры ў адносінах да „Нівы", у Вашай ацэнцы, могуць разглядацца як атака на беларускую меншасць?

— Магу сказаць толькі тое, што падобныя абвінавачанні можна паставіць сотням, сотням асоб дзейнічаючым на тэрыторыі ўсяе краіны, якія вядуць дзейнасць і для рахункаводства не маюць бухгалтараў, якія абмінаюць усе мелі гэтай сістэмы. І чамусьці такія справы не ўзбуджаюцца. Тут па нейкай прычыне гэту справу зачапілі. Для мяне гэта перш за ўсё справа шырокага сістэмнага абсурду. Нявыключана, аднак, што паявіліся тут нейкія непаразуменні на нацыянальным грунце.

— Падобныя і большыя няправільнасці НКП адкрыла ў іншых установах у краіне, аднак, гэтыя справы не былі накіраваны ў пракуратуру, а пасля ў суд?

— Трэба гэтаму прыгледзецца. Без сумнення, што некаторыя рахункаводчыя правілы ў гэтым канкрэтным выпадку былі парушаны. Ды тым горш для правіл, калі яны неадпаведныя жыццёвай сітуацыі краіны. Збудавалі мы юрыдычную дзяржаўную сістэму, якая цяпер аплятае нас сеткай, паралізуючай любыя грамадскія дзеянні. І перш за ўсё гэта недапушчальнае. На маю думку, справа „Нівы" добра закончыцца і тое, аб чым я сказаў, будзе зразумелым.

— Ці ёсць такія небяспека, што справу „Нівы" можа ў прапагандысцкіх мэтах выкарыстаць рэжым Аляксандра Лукашэнкі?

— Лукашэнка не мусіць нічым карыстацца. Калі захоча, выкарыстае тое, што яму сліна на губы прынясе. Калі ўздумае сказаць, што людзі ў „Ніве" — шпіёны, дык будуць шпіёнамі. Ёсць такая руская пагаворка: „против лома нет приёма". У выпадку Аляксандра Лукашэнкі можна сабе ўявіць усё непрадказальнае.

— Ці ў сувязі са справай „Нівы" і ў шырэйшым плане з хібамі сістэмы парламент намерваецца штосьці зрабіць, каб яна змянілася?

— Думаю, што так, хоць гэта не будуць простыя рашэнні. Гэта нейкая сістэма, сканструяваная зусім абстрактна, на такіх жа абстрактных дырэктывах напісаных у Бруселі. Перамена таго і прыстасаванне да польскіх умоў гэта падстава функцыянавання гэтай краіны і адкрытага грамадства. Без таго не зварухнемся. Усё будзе паралізаваным і яно ўжо паралізаванае. Людзям увогуле расхочацца дзейнічаць, а нават і жыць.

Размаўляла Раіна Стэфанчук

Беларускія аўдыёзапісы

Узнікае штораз больш беларускіх музычных калектываў, паяўляюцца новыя салісты, некаторыя беларускія канцэрты становяцца музычнымі падзеямі. Невялікае рэха ад гэтых з'яў можна пачуць у перадачах Беластоцкага радыё, але ў каго ёсць час і магчымасці, каб запісваць перадачы, а потым з прэзентаваных там музычных твораў састаўляць сабе аўдыёкасеты ці кампакт-дыскі для свайго ўласнага ўжытку. Таму вельмі моцна адчуваецца недастатак месца, у якім кожны з аматараў беларускай музыкі мог бы сабе купіць аўдыёзапісы любімых калектываў, дзе можна было б знайсці ўсё, што ў гэтай галіне можна набыць у розных месцах Беластока ці Бельска. Я сам ужо здаўна шукаю аўдыёкасет калектыву „WZ-Orchestra" ці Віктара Шалкевіча.

Мяркую, што гэта ініцыятыва не для рэдакцыі „Нівы" з-за сціпласці кадраў і перагружанасці працай. А можа Брацтва праваслаўнай моладзі хацела б падзарабіць такім чынам? Думаю, што „Ніва" не адмовілася б друкаваць інфармацыю аб тым што, дзе і за колькі можна купіць. Ці ў Беластоку знойдзецца ахвотная асоба, каб заняцца такой дзейнасцю? **М. Ц.**

Сыр з Гайнаўкі

Зараз у Акруговым малачарскім кааператыве (АМК) у Гайнаўцы працуе звыш 200 асоб. Мае ён каля 2 100 пастаўшчыкоў малака, у тым ліку найбольш у Нараўчанскай, Нарваўскай, Гайнаўскай, Чыжоўскай ды Дубіцкай гмінах. Цяпер вялікія сельскія гаспадаркі пастаянна павялічваюць прадукцыю.

Кааператыў развіваецца дзякуючы, між іншым, еўрасаюзным сродкам. На працягу трох гадоў кааператыў атрымаў звыш 8 мільёнаў злотых. Прызначыў іх на мадэрнізацыю і закупку навейшых тэхналагічных установак.

Гайнаўскі АМК пастаўляе на наш рынак, між іншым, масла, цвёрды сыр, тварагі, смятану, кефір і маслёнку. Звыш 30% сваёй прадукцыі высылае на замежныя рынкі. Найбольш жоўтага выспелага сыру. У 2005 годзе ўвялі яго новы сорт — царскі сыр. Высылаюць яго, м.інш., на рускі рынак.

Іншым важным вырабам з'яўляецца тварог: паўтлусты „краянка" і тлусты „клінок" паводле ўласных рэцэптураў. Усе вырабы АМК у Гайнаўцы смачныя ды натуральна-прыродныя, а да таго яшчэ дужа экалагічныя. Каровы тут, у рэгіёне Белавежскай пушчы, пасуцца на чыстых лугах, а зімою атрымліваюць адпаведны корм. І яшчэ адно. Сяляне з Гайнаўшчыны гадуюць кароў традыцыйным спосабам. **(мох)**

У саламяным свеце

Анна і Уладзімір Цэтры за работай

Уладзімір Цэтра з Кашалёў саломапляценнем пачаў займацца, будучы яшчэ маладым хлопцам. Выплятаў ён каробкі, калі масава рабілі іх аднавяскоўцы і жыхары суседніх сёлаў, прадаючы вырабы з саломы за прыстойную цану. Зараз прыбытак ад продажу саламяных талерак, куфраў, збанкоў, ці шлёпанцаў — невялікі. Аднак мой суразмоўца не пакідае свайго любімага занятку. Ён надалей зімовымі днямі і вечарамі сядзіць з саломай у руках і пранізвае яе іголкай з лазовай ніткай. Свае вырабы прадае на кірмашах і мерапрыемствах, ладжаных культурнымі ўстановамі. Штораз больш пакупнікоў прыязджае за вырабамі з саломы да спадара Цэтры. Яго ўмеласці пацвярджаюць ганаровыя граматы і дыпломы, атрыманыя на аглядах саломапляцення.

З саломай з юнацтва

— З саломай пачаў я працаваць у дванаццацігадовым узросце. Знайшоў я старую саламяную каробку для сеяння збожжа і пастанавіў яе адрамантаваць. Расплёў я каробку, з саломы выканаў падобную і рашыў падзарабіць, прадаючы каробкі свайго вырабу на рынку. Калі вырабы мае былі гатовымі, папрасіў я аднавяскоўца (жыў тады мой суразмоўца ў Рудутах) завезці мяне на рынак у Бельску-Падляшскім. Калі ён адмовіўся, з чатырма каробкамі пяшком пайшоў я ў горад і там прадаў свае вырабы. Пасля рабіў я чарговыя каробкі і так падмацоўваў сямейны бюджэт, — пачынае расказ Уладзімір Цэтра.

На бельскім рынку мой суразмоўца пазнаёміўся з работнікам кааператыва „Цэпэлія", які гандляваў вырабамі народных творцаў.

— Стаў я выконваць вырабы з саломы пад заказ „Цэпэліі". Рабіў я каробкі, збанкі і талеркі, — кажа спадар Цэтра.

Ткалі цыноўкі, плялі каробкі

Уладзімір Цэтра ажаніўся з Аннай, жыхаркай Кашалёў. Тады прыйшлося ім прыстасавацца да новых патрабаванняў „Цэпэліі". Абое сталі ткаць саламяныя цыноўкі (маты), якія ў „Цэпэліі" карысталіся вялікім попытам.

— Для цыновак трэба было падрыхтаваць вельмі якасную салому. Жыта жалі мы крыху недаспелае, зеленкаватае і пасля адрэзвалі калассе, якое малацілі без саломы, — успамінае спадар Уладзімір.

— Цыноўкі былі рознай даўжыні і шырыні, у адпаведнасці з заказамі нашых купцоў, — уключаецца ў размову Анна Цэтра, якая працавала разам з мужам. — Калі больш людзей у нашым наваколлі занялося саломапляценнем, паявіліся клопаты са збытам цыновак. З сямідзесятых гадоў заняліся мы пляценнем каробак, чым нашы аднавяскоўцы займаліся ўжо раней.

Па заказе „Цэпэліі" спадар Цэтра распрацоўваў новыя мадэлі каробак, якія пасля накіроўваліся для масавай прадукцыі.

— За каробкі плацілі добра і таму людзі выраблялі іх масава. Калі іх купля спынілася, стаў я выконваць іншыя вырабы. Між іншым рабіў я круглыя мячыкі, у якіх можна было хаваць вартасныя прадметы, — гаворыць спадар Цэтра. — Хаця стаў я зарабляць менш, не пакінуў свайго занятку. Памятаю, як працаўнікі аднаго з арлянскіх прадпрыемстваў заказалі ў мяне сто такіх круглых мячыкаў па 5 злотых за штуку, а пасля аказалася, што прадавалі іх у Варшаве па 15 злотых.

У пошуках новых прадуктаў і ўзораў

Раней продаж саламяных вырабаў быў арганізаваны і саматужнікі чакалі купцоў дома. Зараз Уладзімір Цэтра сам шукае збыту для сваіх вырабаў (каробкі, збанкі, дваяны, куфры на бялізну і разнародныя шкатулкі).

— Да „Цэпэліі" належаў я і складчыны плаціў, але калі развальвалася яна, ніхто маіх узносаў не вярнуў, — кажа спадар Уладзімір. — Засталіся мне разнародныя пасведчанні, ганаровыя граматы, атрыманыя на аглядах і сустрэчах майстроў саломапляцення. Нядаўна прыслалі мне прывітанні з Пуньска, дзе я пабываў са сваімі каробачкамі.

Уладзімір Цэтра паказвае пасведчанне аб прыналежнасці да Саюза народных творцаў. Дзякуючы гэтай арганізацыі, можа ён прадаваць свае вырабы на кірмашах, без вядзення бухгалтэрыі. Польскі прадпрымальнік намерваўся прадаваць вырабы спадара Цэтры ў Расіі, але яму не атрымалася супрацоўніцтва з расійскімі купцамі. Чэх купляў у Кашалях збанкі і вазіў іх на продаж у сваю краіну. Прадпрыемства з Тыкоціна заказала ў майго субяседніка саламяныя кошычкі, каб прадаваць іх разам з экалагічным харчаваннем.

— Каб зацікавіць пакупнікоў трэба шукаць штораз новых прапаноў. Апошнім часам я стаў рабіць шлёпанцы з саломы. Адзін чалавек заявіў, што павесіць іх у сваёй кватэры на сцяне і прычэпіць да іх кветкі, — тлумачыць мой субяседнік. — Усе гэтыя вырабы можна таксама рабіць з сена, або з дзікай травы.

Спадар Цэтра паказвае мне збанкі, а яго жонка Анна — птушкі, выкананыя з травы.

Гаспадараць і плятуць

— Я крыху дапамагаю мужу ў саломапляценні. Аднак многа часу займаюць нам сельскагаспадарчыя работы. У нас ёсць яшчэ 4 каровы, маладняк, свінні, куры і трэба хадзіць каля іх, — кажа спадарыня Анна. — Поле абрабляе зяць, а мы яму дапамагаем. Нядаўна купілі мы камбайн, бо ў маладых ёсць больш поля. Аднак апошнім часам прыбытак ад збожжа невялікі.

Раней спадарства Цэтра садзілі па 2,5 гектара бульбы. Зрабілі яны пад клуняй склад на бульбу, якую ад маразоў ахоўвала сена. Гадавалі яшчэ больш кароў, свіней і авечак.

— Здаралася, што я спаў па некалькі гадзін. Уставаў у дзве гадзіны раніцы і ішоў араць поле. Калі пачынала ўзыходзіць сонца, я вяртаўся дамоў і пачынаў касіць збожжа. Калі я яшчэ не быў жанатым, ездзіў на працу ў блізкі пэгеэр і да прыватных вытворцаў, — успамінае спадар Уладзімір.

Зараз няма ўжо ў майго субяседніка такога здароўя як раней. Перайшоў ён два інфаркты і 24 гады лечыць сэрца.

— Аднак не пакідаю саломапляцення, бо пры ім я супакойваюся і адпачываю. Замест на вуліцы сядзець, я лепш з саломай буду займацца, — кажа Уладзімір Цэтра. — Важна, што яшчэ людзі цікавяцца маёй работай. Бывае, што пакупнікі прыязджаюць здалёк і распытваюцца пра мяне ў вёсцы. Хачу ім паказаць, якім посудам у мінулым карысталіся і падтрымаць традыцыю саломапляцення.

Аляксей Мароз

Быў інструктарам

Сёлета беларуская меншасць у Польшчы адзначае 50-годдзе „Нівы” і Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Гэтаму юбілею „Ніва” адводзіць на сваіх старонках шмат месца. Робіць гэта дасканала Міра Лукша, прэзентуючы расказ Георгія Валкавыцкага „Вось такія былі пачаткі „Нівы”. Чытаючы допісы, я адчуваю сябе саўдзельнікам падзей пяцідзесяцігадовай даўнасці, калі я пачынаў знаёмства з рэдакцыяй — з журналістамі, галоўным рэдактарам, Адай Чачугай, Сакратам Яновічам, Верай Леўчук, Міхасём Хмялеўскім... Многіх ніўскіх журналістаў няма ўжо сярод нас. Адышлі Віктар Рудчык, Аляксей Карпюк, Мікола Гайдук, Міхась Шаховіч, Васіль Баршчэўскі... Няхай ім зямля пухам будзе.

У жніўні 1959 года Аддзел культуры Ваяводскай рады нарадовай у Беластоку арганізаваў у Супраслі трохтыднёвы семінар для беларускіх дзеячаў (удзельнікі на здымку) — з 2 па 22 жніўня. Кожнаму ўдзельніку семінара было выдадзена пасведчанне. У гэтым семінары ўдзельнічала пад трыццаць слухачоў з Гайнаўскага, Бельскага, Сакольскага ды Дуброўскага паветаў.

Юбілей „Нівы”, гэта наша супольнае свята — журналістаў і карэспандэнтаў, даўнейшых, і тых, што зараз пішуць. Гэта шматлюдная сям’я, адданыя беларускай справе людзі. Штуршком для гэтага допісу сталася публікацыя Віктара Буры „Беларускаму таварыству — 50!”. Аднак у юбілейных успамінах аўтара я не прыкмеціў згадкі аб людзях, з якімі ён сустракаўся ў час шматгадовай працы ў якасці інструктара ГП БГКТ і сакратара Гайнаўскага аддзела БГКТ. Віктар Бура адно ў агульных рысах дае станоўчую ацэнку цяперашняму кіраўніцтву Галоўнага праўлення. На маю думку, гэтага мала. Да юбілейнай тэмы і мне хочацца прыкінуць сваіх „пяць грошаў”.

У 1959 годзе выпала мне на долю быць штатным працаўніком Таварыства на пасадзе культурна-асветнага інструктара ў Гайнаўскім аддзеле БГКТ. Заступіў я Лявона Майсеюка, які адышоў працаваць на радыё. Наш аддзел змяшчаўся тады ў будынку па вуліцы Мар’яна Бучка, разам з іншымі маладзёжнымі арганізацыямі. Галоўнае праўленне ўзначальвалі тады старшыня Уладзімір Станкевіч і сакратар Віктар Швед. Праца інструктара ў той час зводзілася ў асноўным да арганізавання гурткоў БГКТ, мастацкіх калектываў ды забеспячэння гэтых апошніх рэпертуарнымі матэрыяламі. Варта прыкмеціць, што ў той час найбольш квітнела мастацкая самадзейнасць. Драмгурткі і вакальныя гурты выраслі як грыбы пасля дажджу.

У жніўні 1959 года Аддзел культуры Ваяводскай рады нарадовай у Беластоку арганізаваў у Супраслі трохтыднёвы семінар для беларускіх дзеячаў. Праходзіў ён з 2 па 22 жніўня. Затым кожнаму ўдзельніку семінара было выдадзена пасведчанне. У гэтым семінары ўдзельнічала пад трыццаць слухачоў з Гайнаўскага, Бельскага, Сакольскага ды Дуброўскага паветаў. Варта адзначыць, што ініцыятарамі культурна-асветнай працы на вёсках былі настаўнікі беларускай мовы. Кіраўніком семінара быў спадар Усцілоўскі (такое прозвішча запамяталася). Тут упершыню я пазнаёміўся з Алесем Барскім, які знаёміў нас з беларускай літаратурай. Сустрэча ў Супраслі замацавала яшчэ шчыльнейшае супрацоўніцтва з беларускімі настаўнікамі. У свабодны час мы адпачывалі над рэчкай, выязджалі збіраць грыбы, наведалі Варшаву. Гэта былі цудоўныя дні, якія назаўсёды пакінулі трывалы след у маёй біяграфіі.

Найбольш актыўнымі ў тэатральна-мастацкай самадзейнасці былі калектывы з Махнатага, Ласінкі, Навасадаў, Палічнай, Арэшкава ды іншыя. У Чаромхаўскай гміне я арганізаваў самадзейнасць у Вульцы-Тэрахоўскай, Кузаве ды Апацы. Памятаю, што ў Апацы калектывам кіраваў Жорж Панько, 45-гадовы настаўнік. Самымі папулярнымі сцэнічнымі творамі былі тады „Прымакі”, „Паўлінка”, „Пярэстая красуля”, „Мікітаў лапаць”. У Апацы, напрыклад, самадзейнікі падрыхтавалі п’есу „Чорт і баба”, „Дзесяць гектараў” і гумарыстычны вадэвіль „Пашыліся ў дурні”. Жорж Панько чытаў на вячорках раман „У палескай глушы” і „Пана Тадэвуша”. З перыяду працы ў Гайнаўскім аддзеле БГКТ захаваў я ў памяці вобраз нястомнага сейбіта роднага слова пенсіянера-настаўніка Васіля Дзуна з Гайнаўкі, аб якім так цудоўна нядаўна пісаў Віктар Бура. Запамяталіся таксама аўтарскія сустрэчы з Віктарам Шведам, канцэрты „Лявоніхі” і танцор Янка Крупа, выступленні мастацкіх калектываў у адлеглых мясцінах Гайнаўшчыны. Калі я працаваў у Гайнаўскім аддзеле БГКТ, то тады ў Бельску-Падляшскім дзейнічаў Канстанцін Майсеня. Варта адзначыць, што на Бельшчыне, як і ў нашым павеце, бурліла культурна-асветная праца. Дынамічна дзейнічалі калектывы ў Дубяжыне пад кіраўніцтвам Сцяпана Стральчука (кіраўніка школы) і настаўніцы Вольгі Тамчук, у Пілiках — пад кіраўніцтвам Пятра Нявінскага, Москаўцах і Сасінах — пад кіраўніцтвам мясцовых настаўнікаў, у Градалях... Дагэтуль запамяталіся мне сустрэчы ў Вульцы-Выганоўскай з настаўніцамі Надзеяй Шатыловіч, Нінай Васілеўскай, Валянцінай Жменька і Марыяй Хрэн, якая цудоўна іграла на акардэоне. Якраз аб гэтых людзях, як і многіх іншых, адданых беларускай справе, якія застаюцца ў цяньку, варта ўспомніць у час юбілею.

Уладзімір Сідарук
Фота з архіва аўтара

Удзельнікі курсаў на экскурсіі ў Варшаве (першы злева аўтар)

Траісты саюз

Пасля мінулагодніх выбараў адны спектаклі прыкмячаем на палітычнай сцэне. Парламентарыі пераможных груповак (постсалідарніцкіх, разумеецца) адно за міністэрскія партфелі ды высакаплатныя пасады змагаюцца.

Важаком у змаганнях з’яўляецца ПіС. Гэтай групоўцы выпала на долю стварэнне ўрада. Праўда, меншаснага ўрада, але ўсё ж такі... ПіС з нікім уладай не хоча падзяліцца. Усе важнейшыя ўстановы ў яго руках: прэзідэнт, маршалак Сейма і Сената, сілавыя ведамствы. Апошнім часам прафарсіравалі закон (пры выдатнай падтрымцы Самаабароны і Лігі польскіх сем’яў) аб радыёвяшчанні і тэлебачанні, нягледзячы на тое, што абаронца грамадзянскіх правоў абскардзіў закон у канстытуцыйны трыбунал. Для ПіСу на законы пляваць! Улада ў іх руках. Што задумаюць, тое зробяць. Як не фокусам, дык шантажам. Так было з даверам для ўрада Казімежа Марцінкевіча, так было з медыяльным законам, як і зараз з парламенцкімі выбарамі. ПіС, не маючы парламенцкай большасці, хадайнічаў ад пачатку за стварэнне саюза, які дазваляў бы фарсіраваць важнейшыя законы. З ліберальнай Грамадзянскай платформай не дагаварыўся. Саюзнікаў знайшоў у партыях Лепэра і Гертыха. Групоўка Яраслава Качынскага афіцыйна прад’явіла саюзнікам: Падпісваем „стабілізацыйны акт”. Самаабарона з ПіСам і ЛПРам стварае траісты саюз. Ці ўтрымаецца ён, у адпаведнасці з дамовай, на працягу года, дык цяжка сказаць.

(ус)

На Новы год

Напрыканцы кожнага года мы традыцыйна высылаем блізкім і далейшым суродзічам святочныя віншаванні і зычым ім моцнага здароўя, шчасця, багацця, радасных Калядаў і шчаслівага Новага года. Але сапраўды пра тое, што прынясе нам Новы год можам толькі дадумоўвацца, бо ўсяго ж немагчыма наперад ведаць. Настаў новы 2006 год і ўжо з першых дзён даведаліся мы, што падаражэлі газ, электраэнергія, некаторыя паштовыя паслугі, радыётэлевізійны абанемент, а таксама, і так ужо вельмі дарагія для курцоў, папяросы. А калі даражэе газ і электраэнергія, дык, вядома, што неўзабаве падаражэюць усе паслугі, аплаты за кватэры, білеты на праезд грамадскім транспартам ды харчовыя прадукты, бо ўсё патрабуе газу або электраэнергіі ў працэсе пераўтварэння ў прадукты харчавання такія як хлеб, мяса, малако і таму падобнае.

Улада гаворыць, што паступова паляпшаецца жыццё ў дзяржаве, бо паменшала беспрацоўе, павысіліся зарплаты, узбуйнела гаспадарка, але гэта ўсё хлусня нашай улады. Яны цяпер адклікаюць з вышэйшых пасад працаўнікоў, якія добра выконвалі свае абавязкі, бо тыя цяпер не звязаны з іхняй палітычнай групоўкай. Найгорш пенсіянерам, якія бяднеюць з году ў год і пра іх ніхто не клапоціцца.

Мікалай Лук’янюк

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 15 -

Пасля апошніх Валянцінак Гражынка была ціхая як ніколі. У школу пайшла была прыгожа апранутая, рыхтавалася, што атрымае прынамсі чытыры „валянцінкі", а прынесла адну толькі, ды не ад таго, ад каго спадзявалася. Да таго тое прызнанне ў прыязнасці пачуццяў было не вельмі прыгожае. Хтосьці крывавата вывеў на лісточку цвёрдай паперы: „Ты мая Валянцінка", побач намаляваў няроўнае сэрцайка чырвоным фламастэрам...

— Ну і што, што яно крывое... — Грак, узіраючыся бачком у няўдалы малюнак, амаль не прылёг на картку. — Папраўдзе, дык сэрца несіметрычнае, каморкі сэрца няроўныя. Агульна беручы, дык гэта сімвал такі. Кр-р, сэрцайка.

— Вось, сімвал. Мог бы той хтосьці хоць пастарацца. І мне было б прыемна, і дзяўчаты не смяяліся б...

— Смяяліся, пэўна, тыя, каму ніхто „валянцінкі" не прыслаў! — бабуля сама пасміхнулася пад носам, гледзячы на няўдалы твор чыйгосьці пачуцця да яе каханае ўнучкі. — Можа, мастак незавялікі той хтосьці, хто гэта намаляваў, але, гэта, сапраўды, падарунак ад сэрца.

Схавала Гражынка картачку пад празрыстую вокладку сшытка па рэлігіі, накрыла зверху часопісам для дзяўчат. Робіць урокі, ды што і раз крадком падымае часопіс за ражок.

— Можа і не так страшна гэта выглядае... Цікава, хто гэта так намодзіў... Стараўся ж. Мабыць, мастак з яго нікудышні...

— Дай, я пачарую крышку, зараз і разведаю, хто такі адважыўся даць табе такую „валянцінку"... — Грак сцягнуў газету са сшытка на стол. — Крррр-рррр... адно заплюшчу вочы. Бачу... бачу... чую дух... нейкі хаос у мяне перад вачыма... сцэну бачу... светлавалосы хлопец... ой, у мяне нейкія, здаецца, нядобрыя асацыяцыі...

— Дык гэта Косця! — з'ёжыў пёры Грак. — Гэта ён цябе рыжай ведзьмай назваў быў у карнавале!

— Вось, бачыш, хацеў прасіць прабачэння, — усміхнулася бабуля. — І так пастараўся!

— Не веру ў вашы чарадзействы! — замахала рукамі Гражынка. — Хоць, праўда, нейкі ён мілейшы зрабіўся для ўсіх...

— Гэта я, я яго правучыў! — залапатаў крыламі Грак і ўзляцеў аж пад столь.

Міра Лукша

З Нараўкі ў Беларусь

Было яшчэ цёмна, калі я прачнуўся і давёў да свядомасці, што сёння едзем.

Гэта быў той дзень, калі мы з сябрам Марцінам Кандрацюком мелі ехаць на Беларусь на фальклорна-этнаграфічную экспедыцыю ў рамках праекта „Забытых таямніцаў чар". Сонца, як на злосць не хацела, акурат сёння, вылезці на неба, а на дварэ быў „дзіка моцны" мароз. Ведалі мы, што на Беларусі напэўна не будзе цяплей. Калі мы ехалі на чыгуначны вакзал у Гайнаўцы, бачылі як сутуленыя людзі спяшаліся на працу. Два тыдні таму я нават не падумаў бы, што так добра запамятаю гэты марозны студзеньскі панядзелак.

На халодным вакзале мы чакалі ўсёй групы, але абсалютна нікога не ведалі, не ехала нават з намі наша настаўніца. У цягніку было таксама холадна як на панадворку, а можа нават яшчэ больш. Не скажу, што было нам цёпла, але дарога нам хутка мінула, бо мы пазнаёміліся з дзвюма дзяўчынамі з Гайнаўкі (прывітанне дзяўчаты!).

На Беларусі да нашага „дому" завезлі нас на аўтобусе. У пакоі было холадна і таму распакоўваць торбу мне не хацелася. „Маю яшчэ час", — падумаў я. Першы дзень прайшоў вельмі хутка, таму што мы знаёміліся з усімі ўдзельнікамі экскурсіі, мелі таксама прывітальны вечар у Высокаўскім доме культуры. Калі мы вярнуліся ў інтэрнат, да позняй ночы гаварылі на розныя тэмы, расказвалі пра сябе.

У аўторак з самай раніцы мы паехалі ў Брэст. Там мы бушавалі па магазінах, бо ж цікава паглядзець, што можна купіць у магазіне за мяжой. Стомленыя гэтай цяжкай працай мы пайшлі ў рэстаран на абед. Добра пад'еўшы, мы пайшлі паглядзець Брэсцкую крэпасць. Вярнуўшыся ў Высокае, усе былі крышку стомленыя, але ж мы не прыехалі сюды спаць, нас чакала яшчэ дыскатэка.

Сераду, чацвер і пятніцу мы правялі спакойна. Уся група ездзіла ў вёскі і размаўляла з людзьмі аб даўніх звычаях, здарэннях, легендах. Былі таксама ў беларускіх школах, у якіх настаўнікі вельмі цікава расказвалі пра свой рэгіён і школу. Вечарам мы мелі ў недалёкім клубе дыскатэку. Сімпатычна было патанцаваць з беларускімі сябрамі пад беларускую (і не толькі) музыку.

У суботу мы зноў паехалі ў Брэст. Гэта быў апошні час, каб купіць штосьці для сям'і, хаця маленькі падарунак. Вечарам зноў чакала нас дыскатэка. Вярнуўшыся з танцаў, мы рабілі здымкі з нашымі сябрамі і доўга, доўга размаўлялі. Ніхто не хацеў ісці спаць.

„Нядзеля, ужо нядзеля", — думаў я едучы цягнікам. Усе дзяўчаты і хлопцы былі сумныя, нікому не хацелася гаварыць. У Польшчы зноў прывітаў нас мароз і хаця нікому не хацелася вяртацца дамоў, не было выхаду.

У машыне, едучы да свайго дому, я ўспомніў гэтыя сем дзён, калі я смяяўся са сваімі новымі сябрамі, як сядзеў ля вогнішча яшчэ дзень раней.

Наступны дзень у хаце быў абы-які, нічога цікавага.

Экскурсія скончылася, але не для мяне. Увесь час у мяне ёсць кантакт з маімі новымі сябрамі з Польшчы і з Беларусі, таму што мы абмяняліся электроннымі адрасамі. Добра, што на экскурсію паехала самая вясёлая і сімпатычная моладзь і добрыя апекуны. Хацелася б, каб такіх экскурсій было больш.

Адам Васільчык
Гімназія ў Нараўцы

Вершы Віктара Шведа

Што рабіць у школе?

Сын нудзіцца страшэнна ў хаце,
Ён злосны, невясёлы.
— Гадоў шэсць скончыш, — кажа маці, —
Пойдзеш тады ўжо ў школу.

— На што ж магу там мець надзею,
Чакаць якога цуду?
Чытаць, пісаць зусім не ўмею,
Ды што ж рабіць там буду?

Галеча раслін

Настаўнік непакоіць:
— Скажы мне, Марцін,
Што гэта такое
Вегетацыя раслін?

Адказ быў Марціна:
— Вегетацыя сведчыць,
Што гэтыя расліны
Жывуць у галечы.

Міра Лукша

Цюльпан

Атрымала Ружа чырвоны цюльпан,
Спавіты цюльпан той быў у цэлафан;
Каб холад пялёсткаў цюльпану не сцяў
Засунулі кветку ў празрысты рукаў.
Стуліўшы пялёсткі, цюльпанік чакаў,
Каб тое адзенне з яго ўжо зняць,
Пад фольгай лакома паветра хапаў,
З няволі прыгожай хацеў уцякаць.
Ды як уцячэш, калі ты цюльпан?
Як вырас у цяпліцы — на люты мароз?..
Паставіла кветку Ружа ў збан.
Што ёй зрабіць, каб яшчэ ён парос?..

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Нарваўскія дзеткі выступаюць у Трасцянцы

Ларыса Геніюш

Курачка

Выйшла курачка на снег,
Пагуляла трошкі.
Гэта ж гора, а не смех —
Босенькія ножкі.

Цыпка бегае па снезе,
Мёрзне з непрывычкі.
На адну нагу прысела:
— Дайце чаравічкі!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Галерэя „Зоркі” (Бельск)

Эдыта Маркевіч

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні — 5,56.

Мая мянушка — няма.

У жыцці хачу стаць, чаму — яшчэ да канца не ведаю, але можа буду настаўніцай, таму што я вельмі люблю дзяцей.

У сяброў цаню — тое, што гавораць праўду і заўсёды маюць час паслухаць пра мае справы.

Не люблю — хітрых і крыклівых людзей.

Па-беларуску размаўляю — з бабуляй, дзядулем, бацькамі, настаўніцай у школе, часам з братам, сябрамі.

Мой любімы гурт — „Прымакі” і „Sm”.

Каля свайго дому пасаджу — чарэшню, язмін і абавязкова нарцысы.

Тры Паўліны і Паўл

— Ведаеш, Марця, — прызналася Паўліна Ш. прыяцельцы, — я зразумела страшную праўду аб сабе.

— Зноў?

— Ага, толькі цяпер гэта не жарты. Ведаеш, ніхто мяне не кахае!

Гімназістка насупілася і, здавалася, праз момант скажа яшчэ нешта больш дэпрэсіўнае.

— А той „Філіжанка”?

— А-а-а, — папракнула Паўліна Ш.

Пасля хвіліны маўчання дзяўчаты дзіка зарагаталі. Іх стыхійны смех панёсся па калідоры. Многія азіраліся. Азірнуўся і Паўл, які чамусьці падумаў, што гэта якраз з яго смяюцца сяброўкі. Замест падысці да іх і разведацца, Паўл пачырванеў і схаваўся ў хвасце, які выстраіўся ля школьнай крамкі.

Ніхто з гімназістаў не бачыў і не ведаў „Філіжанкі”. Некаторыя нават сумняваліся ў рэальнае існаванне такой асобы. Што значыць змайстраваць нейкую выдумку такім шэльмачкам як іх Паўлінка і Марцечка?

— Ведаеце які ён брыдкі! — хіхікалі дзяўчаты.

— І які немагчымы, — заліваліся смехам, — і ведаеце што?.. У яго былі адны адзінкі на канец першага семестра.

Папраўдзе ні Паўліна, ні Марта не былі паклонніцамі турпізму, а наадварот. „Філіжанка” сам неяк папаўся ў іхныя рукі. Бо ён не толькі існаваў у рэальнасці, ён разам займаўся з імі ў мастацкім гуртку, на які раз у тыдзень хадзілі сяброўкі ў гарадскі цэнтр культуры. Наколькі хлопцу стукнула ўжо за дваццаць год, сам зачапляў дзяўчат.

— Гэй, вавёрачка! — крычаў ён услед Паўліне Ш. на цэлы калідор, — мо ў кіно разам сходзім?

Пасля ішла больш ашаламляльная прапанова, напрыклад, „Філіжанка” прапанаваў лекцыю пацалункаў. А праўда такая — яго прапановы адно смяшылі. „Філіжанка” (мянушку прыдумалі яму гімназісткі, якраз гэтая пасудзіна напамінала твар адаратара-нахабніка). Сапраўды, цяжка назваць яго Адонісам. Наадварот, без аглядкі яго можна было б адправіць на конкурс для самых брыдкіх, каб заваяваў там Гран-пры.

(працяг будзе)

Арабінка

Польска-беларуская крыжаванка № 9

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 5: Ла, ты, клік, стэп, ліса, гурт, струна, страла, ял, конь, янтар, бот. Рост, стан, тэатр, тып, рака, гул, клунак, ліра, Об, ліст, яно, Ака, альт.

Узнагароды, **экалагічныя палатняныя сумкі**, выйгралі: **Альжбета Антанюк, Крыстыян Дунда** з Арэшкава, **Эвеліна Бірыцкая, Юстына Навіцкая, Агата Барэчка, Юліта Скепка, Іаанна Леанеўская** з Нараўкі, **Ілона Скепка** з Ягаднік, **Іаанна і Галіна Пуцінік** з Дубін, **Юліта Кананюк** з Нарвы. Віншуем!



Былі калеснікамі

Здаўна жыхары Міклашэва славіліся як майстры па вырабу колаў і вазоў. Складанаму рамяству вучылі яны дзяцей і ўнукаў. Свае вырабы прадавалі ва ўсходнім і заходнім напрамках. Выраб колаў у прыпушчанскай вёсцы спыніўся разам з прыходам тэхнічнага прагрэсу. Калі пасля вайны драўляна-жалезныя калёсы сталі замяшчацца вазамі на гумавежалезных колах, міклашэўскія калеснікі заняліся іншымі відамі сталярскага рамяства або разгарнулі сельскагаспадарчую прадукцыю.

Фота з архіва

Злева: Мікола Салагуба, Фёдар Трусевіч і Алесь Каліноўскі

Рабілі колы пры цары і пазней

— Выраб колаў у Міклашэве быў вядомы пры царскім панаванні. Пры санацыі многія сем'і выконвалі іх у сваіх хатах і прадавалі ў Ялоўцы або Свіслачы, — кажа Аляксандр Салагуба. — Самымі вялікімі майстрамі па вырабу колаў былі ў нас сем'і Леанеўскіх і Трусевічаў.

З цягам часу вырабам колаў занялася большасць жыхароў Міклашэва.

— Мой муж Антон таксама рабіў колы. Асноўная праца пры іх вырабе адбывалася ў хаце. Матэрыял на колы быў з дубу, бярэзіны і ясеню. Пасля вайны колы прадавалі ў Гайнаўцы і адпраўлялі ў Бельск-Падляшскі. Яшчэ памятаю, як на возе загружаным коламі прыходзілася выбірацца ў дарогу, — успамінае Надзея Каліноўская.

Малапрыбытковая работа

— Перад вайной цяжка было знайсці пастаянную працу ў наваколлі Нараўкі і таму людзі ў нас апрача сельскай гаспадаркі масава выконвалі колы. За працу ў лесе плацілі нямнога. Хлопец за дзень работы мог атрымаць 1 злоты 20 грошаў, а дарослы мужчына зарабляў па 2 злоты. Для прыкладу, настаўніца магла тады зарабіць 185 злотых у месяц, а ляснічы нават 320 злотых. У наваколлі Нараўкі было прадпрыемства па вытворчасці тэрпентыну і шклозавод, які потым узарвалі немцы, але туды цяжка было трапіць, — гаворыць Аляксандр Салагуба. — Мой бацька працаваў у лесе і на іншых работах. Больш пастаянную работу знайшоў ён у прадпрыемстве, якое займалася трачаваннем драўніны на будаўнічыя патрэбы. Аднак плата была тут невялікая, бо за атрачаванне аднаго кубаметра дрэва плацілі толькі 10 грошаў.

Пасля ліквідацыі цераспалосіцы ў 1935 годзе жыхары Міклашэва павялічылі сельскагаспадарчую вытворчасць.

— У нашай сям'і было перад вайной 7 гектараў поля, двое коней, тры каровы, цяляты, некалькі свіней і авечак, — успамінае спадар Салагуба.

Вучыліся на трох мовах

У Міклашэве перад вайной была чатырохгадовая школа, у якой усё навучанне вялося на польскай мове. Вучні маглі працягваць вучобу ў школе ў Нараўцы.

— Не ўсе дзеці рашаліся на далейшую адукацыю, бо трэба было дапамагаць на гаспадарцы. Вучням з больш аддаленых вёсак трэба было наймаць кватэры ў Нараўцы, — кажа Аляксандр Салагуба. — Я пасля вучобы ў сваёй вёсцы адзін год вучыўся ў Нараўцы. У 1939 годзе ўспыхнула нямецка-польская вайна і я спыніў адукацыю. Пры савецкай уладзе вучылі нас на рускай мове. Пабеларуску сталі вучыць ужо пасля вайны. Пазней сталі арганізаваць беларускія фэсты і прадаваць „Ніву".

Каляснічы кааператыў

Пасля вайсковай службы мой суразмоўца працаваў у лесе. У 1951 годзе ў Міклашэве заснавалі Каляснічы вытворчы кааператыў і Аляксандр Салагуба паступіў туды на працу.

— Належалі мы да Ваяводскага саюза кааператываў і нашы колы прадавалі па ўсёй Польшчы, — гаворыць спадар Салагуба. — Чатыры гады працаваў я ў кааператыве рабочым, а пасля стаў ім кіраваць. Каб займаць кіраўнічую пасаду, трэба было мне шляхам курсаў закончыць сямікласную падставовую школу і школу кіраўнікоў дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў.

Калі сталі пашырацца вазы на гумавых колах, кааператыў у Міклашэве заняўся сталярскай вытворчасцю і будаўнічымі працамі. У 1965 годзе перавялі яго ў Нараўку і разам з ім рабочых.

У Міклашэве не было калгаса, але дзейнічаў сельскагаспадарчы гурток. Пасля ягоныя машыны перадалі сельскагаспадарчаму гуртку ў Нараўку.

— Ад сельскагаспадарчага гуртка асталіся ў вёсцы пустыя старыя гаражы, а пасля абанкруціўся таксама гурток у Нараўцы, які выконваў сялянам палявыя паслугі, — кажа Ян Драўноўскі.

Жыхары Міклашэва памятаюць Канстанціна Майсеню, які кіраваў будовай кааператыўнага магазіна ў іх вёсцы, што працуе па сённяшні дзень.

— Канстанцін Майсеня начаваў у маёй хаце. Раіў мне, каб я працаваў сумленна і не нажываўся за кошт супольнага дабра, — успамінае Аляксандр Салагуба.

Усе чыталі „Ніву"

— У шасцідзесятых і сямідзесятых гадах вёска была шматлюднай. Тады ўсе ў Міклашэве чыталі „Ніву". У хаце майго бацькі „Ніва" была ўвесь час. Чыталі мы „Сардэчныя тайны", артыкулы пра жыццё ў іншых вёсках і пра культурныя падзеі. Нашы дзеткі, якія ў нараўчанскай школе вучыліся беларускай мове, чыталі „Зорку", — гаворыць Зоя Драўноўская.

У Міклашэве дзейнічаў гурток вясковых гаспадынь.

— Вучыліся мы пячы і варыць. На адных занятках займаліся мы з мясам з вепрука. Ездзілі на спатканні ў Беласток і Гайнаўку. Можна было ў нас пазычаць посуд на розныя мерапрыемствы, — кажа былая старшыня гуртка Надзея Каліноўская.

Беларускі калектыў

У 1977 годзе ў Міклашэве быў заснаваны беларускі вакальны калектыў. Яго арганізатарам была Яўгенія Богуш. Спачатку жанчыны самі рыхтаваліся да выступленняў на сцэне, падбіраючы мясцовы рэпертуар. Пасля апекаваўся імі Янка Крупа.

— Гэта Яўгенія Богуш намовіла нашых жанчын заснаваць калектыў і спачатку спатыкаліся мы ў яе на рэпетыцыях. Выступалі мы на аглядах „Беларускай песні" ў Гайнаўцы, Беластоку і займалі там добрыя месцы. Было нас каля дзесяці жанчын. Я была наймалодшай спявачкай і выступала разам з мамай, — успамінае Зоя Драўноўская. — Раней усе мерапрыемствы былі беларускімі. Выступалі мы на беларускіх фэстах у Свінароях, Нараўцы і іншых мясцовасцях. Пасля выступленняў на сцэне сустракаліся з мужамі і гасцявалі. Тады маладым людзям весялей жылося, чым цяпер. Зараз маладыя ўключаць тэлевізар і сядзяць перад ім.

Яўгенія Богуш была актыўнай вясковай грамадскай дзяячкай. Сарганізавала ў вёсцы клуб і ладзіла ў ім сустрэчы.

— Жэня была душой усёй нашай вёскі. Яна была раднай і ездзіла ў Гайнаўку афармляць усе сельскія справы. У 1977 годзе наладзілі ў нашай вёсцы беларускі фэст, а яго галоўным арганізатарам была наша Жэня, — расказвае Зоя Драўноўская. — У клубе сустракалася моладзь, а Яўгенія прадавала там прадукты. Хацела яшчэ заснаваць тэатр для дзяцей, але не паспела.

Яўгенія Богуш загінула ў дарожнай аварыі ў 1983 годзе і пасля яе смерці міклашэўскі калектыў спыніў дзейнасць.

— Смерць нашай Яўгеніі была нечаканай. Загнала яна кароў і вярталася на веласіпедзе дамоў. Наехаў на яе малады хлопец на матацыкле. Загінула адразу, — кажа спадарыня Драўноўская. — Не стала Жэні і ўсё развалілася. Добра, што пажаніліся яе сыны, якія асталіся сіротамі.

Работа з'ела мужчын

Зараз у многіх хатах Міклашэва жывуць пенсіянеры. Сярод іх многа ўдавіц, бо іх мужы ўжо паўміралі.

— Работа з небяспечным грузам на перавалачнай базе побач Нараўкі з'ела многіх нашых мужчын. У час перагрузкі небяспечнага для здароўя азбесту трэба было працаваць у вагонах, у якіх панавала вялікая жара, — гаворыць спадарыня Зоя. — Перагрузка іншых прадуктаў таксама была цяжкай, а многія мужчыны пасля працы яшчэ выпівалі.

Цяпер маладыя людзі з Міклашэва, якія канчаюць вучобу, наракаюць на беспрацоўе. Старэйшыя асобы таксама застаюцца без працы; мала хто займаецца перагрузкай тавараў з-за ўсходняй мяжы.

— Калі раней нехта з нашай вёскі хацеў знайсці работу ў нашым наваколлі, то не было праблем з гэтым. Зараз многа людзей астаецца без працы, а прыбытак з сельскай гаспадаркі невялікі, — кажа Ян Драўноўскі.

Заняліся сельскай гаспадаркай

У Міклашэве ёсць яшчэ некалькі гаспадароў, якія разгарнулі сельскагаспадарчую прадукцыю.

— У нашага суседа Яна Семянякі каля 20 дойных кароў, а ўсяго быдла будзе там пад 30 штук. У яго ёсць таксама свой умяшчальнік на малако. У Юркі Трусевіча будзе пад 10 кароў і бычкоў, — інфармуе Ян Драўноўскі.

Зараз у Міклашэве каля 10 дзетак у дашкольным і школьным узросце.

— Раней усе жыхары Міклашэва былі праваслаўнымі. Зараз трэцяя частка нашых жыхароў гэта каталікі. Многа хлопцаў пажанілася з дзяўчатамі каталіцкага веравызнання і памянялі канфесію. Я вучыла сваіх дзяцей размаўляць на гаворцы, а зараз маладыя карыстаюцца ўжо толькі польскай мовай, — гаворыць Зоя Драўноўская.

Фота з архіва

Калектыў з Міклашэва часта выступаў на беларускіх мерапрыемствах (першая справа Зоя Драўноўская; трэцяя злева Яўгенія Богуш)

Аляксей Мароз

Вось такія былі пачаткі „Нівы”

- 10 -

Размова з Георгіем ВАЛКАВЫЦКІМ.

— „Ніва” друкавала таксама і палемічныя тэксты наконт хібаў у дзейнасці БГКТ, папікала ў бюракратызме (славутая навагодняя батлейка 1957 г.), „збаўцы” БГКТ стараліся „прыбраць да рукі «Ніву»” як Уладзімір Станкевіч...

— Я не хачу нічога кепскага сказаць пра БГКТ. Ды мне падабалася свабода. Ужо ў першай прамове новы старшыня („Ніва”, 21 верасня 1958 г.), дакараў „некаторых актывістаў”, што прабуюць „не прыкмячаць значных дасягненняў” БГКТ і ўсіх абвінавацій у блізарукасці. Аб’явіў „бязлітасную барацьбу” польскаму і беларускаму нацыяналізму, „урэальніў дарогу да агульнай мэты”. Ахарактарызаваў гурткі, загадаў пазбіраць складчыны, пры кожным аддзеле стварыць эстрадную групу. Вызначыў „Ніве”: кожны член і сімпатык БГКТ меў стаць карэспандэнтам „Нівы”.

— Сярод ніўскіх рубрык пастаянная была „Хроніка БГКТ”, „Людзі БГКТ”, дзе прадстаўляліся актывісты і простыя дзеячы Таварыства. Вось пра Кастуся Майсеню, дзе са здымка спаглядае ён малады, тады дырэктар будаўнічага павятовага прадпрыемства ў Бельску-Падляшскім, кіраўнік павятовага аддзела Беларускага таварыства ў Бельску-Падляшскім („Ніва”, 4.02.1958 г.). Рубрыкі пра вясковых настаўнікаў і настаўнікаў роднай мовы, інфармацыі пра выдавецкія планы БГКТ, дакладныя аналізы дзейнасці Таварыства ў цэнтры і глыбінцы. Пісалі таксама дзеячы, настаўнікі, сяляне пра важнае для іх і набалелае. Цэлая старонка адводзілася на „Лісты... лісты... лісты...” Відаць, што беларускія справы гэта і арганізацыйныя, і ўсё, што роднае і важнае ў мясцовасцях Беласточчыны, і ўсё гэта кранала сэрцы карэспандэнтаў і проста чытачоў, якія браліся за аловак і пісалі ў сваю газету. Таму „Ніва” не была нейкім бюлетэнем Таварыства ды партыі, а жывой газетай, якую чакалі ў кожнай хаце. Ці станкевічаўскаму праўленню БГКТ была даспадобы нейкая „разняволенасць” беларускага тыднёвіка?

— Уладзімір Станкевіч быў родам з Бераставіцы, як і першы сакратар ПАРП у Беластоку Аркадзій Лашэвіч. Пра Лашэвіча было вядома, што ён — беларус, але гэтага не падкрэсліваў. Дарэчы, тыя лікі беларусаў на дзяржаўных ці партыйных пасадах гэта міфы. Калі нават які і трапляўся, дык хаваўся з гэтым, стараўся не паказваць, а нават даказаць, што ён не беларус, нават маючы тыпова беларускае прозвішча. Лашэвіч ніколі ў Таварыства не зайшоў. Наш старшыня падкрэсліваў дружбу з першай асобай у ваяводстве, праводзіў „рытуальныя” „размовы з Лашэвічам” у час пасяджэнняў Прэзідыума ГП БГКТ. „Arkadiusz? Cześć! Tu Stankiewicz. Jak tam nasze sprawy?” Я спачатку не разумеў, чаму старшыня Станкевіч так шчыра запрашае мяне на розныя мерапрыемствы і ўласныя выезды. Аж зразумеў: трэба яму прыдворны пісьменнік, каб занатоўваць падзеі ды хваліць у газеце, як „першага”.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— У Таварыства пайшоў быў Сакрат Яновіч. Ды гепісцкія функцыянеры С. Яновіч і Віктар Швед успамагалі рэдакцыю пяром. Станкевіч адышоў з пасады старшыні (1960), пакінуўшы па сабе Лідзію Бялецкую, якая прайшла гулагі, вярнулася ў 1956 г. Па-беларуску не гаварыла.

— Пасля „Апошняга пасяджэння” — навагодняй батлейкі ў „Ніве” (1962) Лідзія Бялецкая „ўзняла буру ў шклянцы”. Героямі „Пасяджэння” былі: старшыня ГП (стары і новы), функцыянеры ГП — Юзвюк, Яновіч і Хлябіч ды паэт Барскі. Партрэт старшыні ў выкананні карыкатурыста не спадабаўся, як і іншыя яе партрэты ў „Ніве”. Далажыла Лашэвічу аб маім непадпарадкаванні. На малюнку пад сталом валяліся парожнія бутэлькі! Угнявіў яе таксама першакрасавіцкі жарт пра кубак „Нівы”, на які мела не паскупіцца „Betesca”.

— Уладам не заўжды падабаюцца жарты. „Ніва” займалася справамі першараднымі, так сказаць, вартымі першых старонак растучай у сацыялістычную сілу краіны, але змяшчала таксама лісты, якія кранаілі паасобныя лёсы.

— Як допіс з просьбай паратунку ад Волькі Парфянюк са Збуча, якой суседка Наталля Б. заманьвала ейную курыцу да сябе на падворак. Да каго, як не да „Нівы” мела звярнуцца бедная сялянка (1,50 га), калі тая Наталля Б. — жонка старшыні грамадскай рады?..

— Самыя тэмы, так сказаць, прыходзілі ў „Ніву”. Журналісты разведвалі „тэрэн”, самі вучыліся прафесіяналізму (адзіным журналістам са спецыялістычнай адукацыяй быў Міхась Хмялеўскі), а быў час, што... уся рэдакцыя вучылася. Уладзімір Паўлючук нават працуючы ў „Ніве” абараніў доктарскую дысертацыю.

— Быў такі час. Усе пайшлі ва універсітэт, нават наша машыністка Ніна Бручко. Вядома, шмат часу ішло ім на навуку, цяжка было выпаўніць план. Запрапанаваў я кожнаму рубрыкі і тэмы. На аўтарах мне залежала. Прапанаваў я пастаяннае супрацоўніцтва і пазарэдакцыйным аўтарам. Некаторыя крыўдзіліся: не друкуе „Ніва” іх тэкстаў. Вось Лена Глагоўская друкуе ў апошні час лісты Мар’яна Пецюкевіча: „Ніва” несумленная, не друкуе ягоных матэрыялаў. А я ж памятаю — ішоў тэкст, толькі што пакуль сапраўды той допіс паказаўся, прайшло шмат часу. Гэта не сённяшняя тэхніка, кожны нумар тыднёвіка рыхтаваўся месяц наперад.

— Прафесар Белаказовіч успамінае, што „Ніва” адмовілася яго друкаваць.

— Дык жа гэта няпраўда. Перастаў нам проста дасылаць матэрыялы.

— У сваіх успамінах не забываеце пра ніўскія падзеі менш ці больш важныя. Дэбюты, нядрэнныя тэксты карэспандэнтаў, іхняе паходжанне... Хваліце сваіх журналістаў, стары састаў, і новы — па чарзе, як Вы іх знаходзілі. Маецца такое ўражанне, што мелі Вы шчаслівую руку.

— Я і сам сустракаў шчаслівых людзей, якім я спадабаўся. Пачынаючы ад тых, хто мяне запрыкмеціў і запрапанаваў заданне. З удачлівым камандзірам і салдатам удача. З таго першага саставу, калі нават хто і адышоў, то не пры мне памёр.

— Пералічвалі Вы ўжо па чарзе, хто прыходзіў у газету. Хто адціснуў свой след на старонках і ў свядомасці чытачоў, беларусаў. Вера Леўчук, Сакрат Яновіч, Уладзімір Паўлючук, Васіль Баршчэўскі, Міхась Хмялеўскі, Міхась Кураш, Мацей Канапацкі, Яніна і Пятро Чэрнякевічы, Віктар Рудчык, Мікола Гайдук, Янка Целушэцкі, Міхась Шаховіч — да адыходу ў „Кантрасты”... Юрка Трачук — да 1985 года, Ада Чачуга. Мела я гонар таксама быць адабранай з групы прэтэндэнтаў і прынятай Вамі ў калектыў як наймалодшы ў той час працаўнік, праўда, пасля 12-гадовага супрацоўніцтва з газетай. Бывае, памяць падводзіць. Вы захавалі дакументы, лісты, нататкі, і памяць у Вас адметная. Што думаеце пра „адкрыцці”, якія трапляюцца асабліва ў апошні час?

— Гэтыя „рэвеляцыі”, бывае, моцна разыходзяцца з праўдай.

— Можаце развеяць „міфы” ці звычайныя хібы ў памяці? Я, як адзін з Вашых чытачоў, адчуваю давер Вашым словам.

(працяг будзе)

Размаўляла Міра Лукша

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

ЧАГО ВЫ СПАДЗЯЕЦЕСЯ АД 1962 г.?

АДКАЗВАЕ НАШ КАРЭСПАНДЭНТ МІКАЛАЙ ПАНФІЛЮК

Чаго я спадзяюся ад 1962 года? Перш за ўсё, лепшага і больш цеснага супрацоўніцтва з Вамі, а таксама з Беларускім грамадска - культурным та-

Цікава пазнаёміцца з творчасцю нашых сучаснікаў праз прызму старадаўніх форм напісання вершаў, якія да XX стагоддзя мала хто ведаў...

www.avanhard.narod.ru

Чытаць вершы паэтаў-авангардыстаў часам вельмі цікава — гэтыя творы даюць магчымасць крыху паіншаму паглядзець на сучасную рэчаіснасць, убачыць тое, чаго ў звычайным паўсядзённым жыцці не заўважаеш. Яшчэ больш цікава знаёміцца з творчасцю нашых сучаснікаў праз прызму старадаўніх форм напісання вершаў, якія да XX стагоддзя мала хто ведаў не толькі з беларускіх аматараў паэзіі, але і ўласна беларускіх паэтаў. Пэўна, менавіта для такой магчымасці знаёмства з паэтычнай творчасцю і быў створаны сайт „Беларускі авангард", які месціцца ў Інтэрнэце па адрасе: http://www.avanhard.narod.ru.

Калі набраць на сваім камп'ютэры вышэйпададзены адрас, то перад нашымі вачыма адкрыецца яго арыгінальная галоўная старонка — на чорным фоне, як сінія прагаліны, выйсці да ягоных рубрык. У цэнтры надпіс-назва сайта. Выйсці да рубрык напісаныя як кірыліцай, так і лацініцай і гэта дае магчымасць знаёміцца са зместам „Беларускага авангарда" каму як зручней. Кожная алфавітная версія мае толькі па тры рубрыкі: „Хоку", „Вершы" і „Гасцёўня", але, калі мы выйдзем на якую-небудзь з іх, нам адкрыюцца іншыя.

Найбольш цікавай з пункту погляду знаёмства з незвычайнай для беларусаў формай вершаванага выяўлення думкі ёсць „Хоку". Для тых, каму гэтае слова не гаворыць пакуль нічога, падаецца выдатнае тлумачэнне. „Хоку — трохрадкоўе, якое бярэ выток у японскім вершаскладаньні. Разам з рубаі і танка хоку — гэта праклад усходняй вершаванай мініятуры. Хоку пісалі вялікія старажытныя японскія паэты Басё, Бусон, Іса. У XX ст. гэтай мініятураю захапляліся Сікі, Кёсі, Дакоцу... — распавядаюць нам пра незразумелае слова распрацоўшчыкі сайта. — Папулярнасьць хоку выйшла за межы Японіі, трохрадкоўі пішуцца ва ўсім сьвеце... Кніга хоку беларускіх паэтаў была падрыхтаваная яшчэ ў 1986 годзе, але не знайшла выдаўца, бо ў БССР нават нязвыклая форма ўспрымалася як дысыдэнцтва". Адной з галоўных падстаў у напісанні хоку ёсць строгая вытрымка ўсіх складоў у радках як 5-7-5.

З левага боку ад тэксту пра вершы месцяцца выйсці да хоку беларускіх літаратараў. Сярод іх такія добравядомыя імёны як Уладзімір Арлоў, Адам Глёбус, Максім Танк і іншыя. Праўда, пры знаёмстве з хоку-творчасцю, што прадстаўленая на сайце, не ва ўсіх хоку бачыцца вытрымка вышэйпазначанага памеру радкоў.

У левым верхнім вугле і ўнізе месцяцца выйсці да іншых рубрык, сярод якіх ёсць і непазначаныя на галоўнай старонцы. Рубрыка „Вершы" адкрываецца выдатным творам Міхала Анемпадыстава „Чаканне Калядаў". Побач злева размешчаны выйсці да вершаў астатніх паэтаў.

На старонцы „Гасцёўня" знаходзяцца паведамленні ад наведвальнікаў сайта. Таксама тут можна пакінуць і сваё ўражанне ад „Беларускага авангарда".

Рубрыка „Пра праект" не зусім зразумелая, бо яе змест не надта адпавядае назве. Змешчаны нейкія ці то імёны, ці то мянушкі тых, хто спрычыніўся да стварэння сайта, а таксама спіс крыніц, адкуль была ўзята інфармацыя для сайта. На назвах некаторых з іх, такіх як газета „Наша Ніва", партал „Дзед Талаш" сайт гурту „Новае неба" і некаторыя іншыя ўсталяваныя гіперспасылкі, што дае магчымасць хуткага пераходу на даныя Інтэрнэт-бачыны.

Уладзімір Лапцэвіч

Пакуль жа нашыя ўдзельнікі гульняў размяшчаюцца далёка ад п'едэстальнага Алімпа...

Беларусь, беларусы...

Пад Алімпам

Дзевяць дзён турынскай алімпіяды не прынеслі беларускім заўзятарам аніякіх станоўчых эмоцый. Аднак, наперадзе яшчэ асноўныя „нашыя" дысцыпліны, дзе ёсць рэальныя шанцы на поспех. На медалі беларускія спартоўцы могуць разлічваць толькі ў фрыстайлі і жаночай біятлоннай эстафеце. Пакуль жа нашыя ўдзельнікі гульняў размяшчаюцца далёка ад п'едэстальнага Алімпа.

У мужчын-біятланістаў цуда не здарылася. Як выступалі ўвесь сезон нашы страляючыя лыжнікі няўдала, так і працягваюць выступаць. У індывідуальнай гонцы на 20 кіламетраў лепшы з беларусаў Сяргей Новікаў стаў толькі 24-м, астатнія не трапілі нават у сорак мацнейшых. На дзесяцікіламетровай спрынтэрскай дыстанцыі было мала лепш: Рустам Валіулін заняў 25-е месца, Алег Рыжанкоў — 30-е, Новікаў — 32-е. З такіх пачатковых пазіцый разлічваць на добры вынік у наступнай гонцы пераследу было марна.

Лепш за іншых беларускіх спартоўцаў выступае біятланістка Вольга Назарава. У першай гонцы на 15 км яна заняла высокае 8-е месца, сваім парадкам прыма нашай дружыны Алёна Зубрылава размясцілася на 15-й пазіцыі. Пасля дыскваліфікацыі за допінг расіянкі Пылёвай беларускі перамясціліся на адну пазіцыю вышэй. На спрынтэрскай трасе наш лідэрскі тандэм выступіў добра. Зубрылава стала 5-й, а Назарава — зноў 8-й. Абедзве абсалютна дакладна стралялі, але для таго, каб трапіць у прызёркі, замарудна беглі. Прыкра, бо Зубрылавай да бронзы забракла менш 3 секунд. А ў гонцы пераследу Назарава паказала сёмы час. Што ж, тройчы трапіць у васьмёрку — таксама прыкмета высокага класа.

А лыжнік Сяргей Далідовіч зусім не стартаваў па прычыне адхілення ад удзелу. У яго крыві, як і ў шэрагу іншых, быў выяўлены празмерна высокі ровень гемаглабіну. Гэта не ёсць парушэннем, але лічыцца рызыкай для здароўя спартоўца і падставай для нядопуску. Спецыялісты тлумачаць такі склад крыві перападам вышыняў. Далідовіч экстранна вярнуўся дамоў, але плануе вярнуцца ў Турын і ў выпадку паспяховага здавання тэсту, выйсці на сваю каронную марафонскую дыстанцыю — 50 км. Іншы прадстаўнік Беларусі Аляксандр Лазуткін узяў старт на дыстанцыі 15 км класічным ходам і выступіў вельмі добра, паказаўшы свой лепшы асабісты вынік на топ-турнірах. У Турыне ён стаў 16-м, а да гэтага лепшым вынікам Лазуткіна было толькі 38-е месца на леташнім чэмпіянаце свету. У беларускіх дзяўчат-лыжніц прэтэнзій ні на што сур'ёзнае быць не магло. На дыстанцыі 10 км класічным стылем з асобным стартам Алена Саннікава і Людміла Шаблоўская замкнулі трэці дзесятак удзельніц. Такі вынік у параўнанні з ранейшымі месцамі для іх таксама станоўчы.

Адзіная беларуская канькабежка Святлана Радкевіч на дыстанцыі 500 м была толькі 27-й. На такой жа дыстанцыі па шорт-трэку наша Юлія Елсакова не прайшла нават кваліфікацыю. А фігурыст Сяргей Давыдаў заняў нізкае 15-е месца. На жаль, ніхто з іх не здолеў скокнуць вышэй галавы. Даводзіцца канстатаваць, што гэта вынік агульнага слабога развіцця ў Беларусі азначаных відаў спорту.

Уладзімір Хільмановіч

Да роднага

Пра арганізацыю беларускага грамадска-культурнага жыцця ў колішнім Сямятыцкім павеце расказвае Міхал ВІШАНКА, колішні інструктар ГП БГКТ на Сямятыцкі павет.

Пра найпершыя беларускія ініцыятывы ў Сямятыцкім павеце я не ведаю, бо я сутыкнуўся з імі ў канцы 1960 года. Сядзеў я дома, калі паказаліся нейкія людзі. Былі гэта Лідзія Бялецкая — тадышняя старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Уладзімір Юзвюк — сакратар ГП БГКТ і Янка Вішанка — працаўнік нашай гміны, які ў той час быў членам Галоўнага праўлення; відаць, гэта ён быў ініцыятарам стварэння Сямятыцкага аддзела таварыства. Мабыць, што ён запрапанаваў мяне для гэтай справы. Я згадзіўся.

Спачатку стварылі ініцыятыўную групу, наладзілі сход. Прыехалі Сакрат Яновіч і Янка Вішанка. Яновіч сказаў прамову і наша група рашыла арганізаваць па вёсках гурткі таварыства. Прыслалі нам з ГП машыну і мы — Васіль Леанчук з Машчонай-Панскай, Анатоль Мартыновіч, загадчык школы ў Вульцы-Нурэцкай, сам родам з Орлі ды Сяргей Крэйза з Мілейчыч — узяліся за справу: арганізавалі гурткі і адразу выбіралі дэлегатаў на павятовую канферэнцыю. Тады паўсталі гурткі ў Мілейчычах (больш за дзвесце чалавек), Мікулічах, Рагачах, Мядзвежыках, Нурцы-Вёсцы, Вілянове (там лідэрам была Лідзія Бонда, прадаўшчыца), Тымянцы, Літвінавічах, Клюковічах, Зубачах, Баброўцы, Вычулках (там быў Уладзімір Баранчук), Вульцы-Нурэцкай (Мікалай Кусачук), Машчонай-Панскай і Сямятычах. Не па ўсіх вёсках удавалася наладзіць беларускую грамадска-культурную дзейнасць, не ўдалося арганізаваць гурткоў у такіх вялікіх вёсках як, напрыклад, Слохі-Аннапольскія ці Мельнік.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У сакавіку 1961 года адбылася раённая канферэнцыя таварыства ў Мілейчычах. Стварылі аддзел пад старшынствам Анатоля Мартыновіча. Сталі арганізаваць тэатральны аматарскі рух. Калектыў з Мілейчыч ставіў „Гарадскіх гасцей" Аляксандра Баршчэўскага, калектыў з Рагачоў „Паўлінку" Янкі Купалы. Тэатральныя калектывы працавалі яшчэ ў Вульцы-Нурэцкай, Літвінавічах, Клюковічах, Вілянове і нават у Сяміхочах, дзе гурток БГКТ не паўстаў.

З ходам часу моладзі на вёсках стала меншаць і калектывы распадаліся. Пасля ліквідацыі паветаў сталі ладзіць конкурсы беларускай песні. Тады наш раён БГКТ узбуйнілі — дадалі нам тэрыторыю Боцькаўскай, Кляшчэлеўскай і Чаромхаўскай гмін. Удалося нам сарганізаваць невялікія вакальныя калектывы. У Чаромсе-Вёсцы асабліва вылучыліся Люба Салінская, Лідзія Козуб і Галіна Кердалевіч. У Вульцы-Тэрахоўскай — спадарыня Вэрамюк і многа дапамог Уладзімір Сідарук, у Дабрывадзе — Барбара Ліпінская. Узніклі калектывы ў Агароднікахна-Бугу (там вылучаўся саліст Бонда), Мельніку, Тымянцы, Дашах, невялікая група ў Тапарках, вакальная група ў Нурцы каля Боцькаў. Былі і адзінокія спевакі: Ніна Такаюк і Яўгенія Вішанка з Мікуліч і Язэп Карпюк з Сямятыч.

У арганізацыі грамадска-культурнага і мастацкага руху на нашай тэрыторыі вялікую ролю адыграла „Лявоніха". Беларуская эстрадная група прыязджала куды толькі можна было, а народ ішоў на яе выступленні як на вялікае свята. Пазней, яшчэ пры паветах, сталі ладзіць народныя фэсты. На працягу звыш пяці гадоў пастаянна ладзілі мы фэст у Літвінавічах, на Тройцу, і ўжо пасля дванаццатай гадзіны сходзілася маса народу, людзі ішлі і ішлі. Пасля фэсты ладзілі ў розных мясцовасцях: Вілінаве, Мельніку, Нурцы-Станцыі, Мілейчычах. Ладзілі і шмат аўтарскіх сустрэч, найбольш з Віктарам Шведам ды з Алесем Барскім, Васілём Петручуком, Міхасём Шаховічам і Сакратам Яновічам.

Мастацкім калектывам у падборцы рэпертуару многа дапамагаў Янка Крупа, які наведваў калектывы два-тры разы ў месяц. Ездзіў да калектываў і Славамір Місяюк, загадчык Дома культуры ў Кляшчэлях. З Галоўнага праўлення прыязджаў Мікалай Лобач. Тут, на месцы, вялікую дапамогу аказваў мне Віталь Луба, які выхадайнічаў мне памяшканні ў Мілейчычах і Сямятычах, дзе я мог трымаць дакументацыю аддзела.

Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ладзіла раз у месяц сустрэчы сваіх працаўнікоў з аддзелаў. Кожны інструктар даваў справаздачу са сваёй дзейнасці. Было падсумаванне і дырэктывы на чарговыя месяцы; так было за цэлы час маёй працы ў таварыстве — з 1960 да канца 1990 года, да майго адыходу на пенсію.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Прывітанне Сямятычам ад Мізгіроў

Вёска Мізгіры — адна з аддаленых вёсак Слонімшчыны. Даехаць да яе не так проста, асабліва зімою. Тым не менш наш карэспандэнт вырашыў заглянуць у гэтую слонімскую глыбінку. Сярод невялікай колькасці мясцовых жыхароў там пражываюць і дзве доўгажыхаркі. Гэта Марыя Себяшчук, якой ужо за 90 гадоў, і Вера Андрайчук, якая праз месяц адзначыць сваё 100-годдзе.

Вера Дзмітрыеўна Андрайчук жыве з сынам і нявесткай. Ім таксама ўжо за 70. Калі мы ўвайшлі ў іх цёплую хату, бабулька драмала на ложку ля печкі. „Холадна ёй, таму палім печку і палім", — сказала нявестка Веры Дзмітрыеўны, Лізавета Канстанцінаўна.

Убачыўшы незнаёмага госця, жанчына паднялася з ложка і з дапамогай Лізаветы Канстанцінаўны прысела на табурэтку ля печкі.

— Зімой наша бабулька зусім не выходзіць на вуліцу, а летам бавіць час на дварэ: пасядзіць на лаўцы, паразважае пра нялёгкае сваё жыццё. Калі ўспамінае радаснае — усміхаецца, калі гора — плача, — гаворыць маладзейшая кабета.

Са слоў Веры Дзмітрыеўны і яе нявесткі даведаўся я, што найлепш бабульцы жылося ў Сямятычах на Беласточчыне да вайны. Яна выйшла замуж за Андрэя Андрайчука. А Андрэеў бацька быў багатым чалавекам. Меў 30 гектараў зямлі, свой лес, некалькі кароў, трымаў авечак, коз — адным словам, сям'я была заможнай. Але пасля вайны,

Фота Сяргея Чыгрына

Вера Андрайчук

калі пачалося перасяленне польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу, а беларусаў з Польшчы ў Беларусь, іх сям'і загадалі пакінуць тэрыторыю Польшчы і далі 24 гадзіны на зборы. Так за суткі сям'я Андрайчукоў, страціўшы ўсё, пакінула родныя мясціны.

Пасля Сямятыч Андрайчукі прыехалі на Слонімшчыну. Пасяліліся ў Мізгірах. Тут і дажыла да свайго 100-годдзя Вера Дзмітрыеўна. „Мужа Андрэя няма ўжо побач 35 гадоў. А я жыву і жыву", — уздыхае жанчына.

Вера Андрайчук усё жыццё адпрацавала ў калгасе. Але ў Сямятычы з любым Андрэем і дзецьмі так ні разу і не з'ездзіла, хаця сваякі там жывуць. Горка ад гэтага неяк на душы. Той час выгнання не дае спакою і сёння.

— Як вам так пашэнціла пражыць столькі гадоў? — пытаюся ў доўгажыхаркі Мізгіроў.

— Сама не ведаю як. І гора бачыла шмат, і цяжка працавала. Ды і ў харчаванні пераборлівай не была. А цяпер люблю салодкае. Можа, з-за таго, што жыццё было горкім, — усміхаецца бабуля.

— А крама ў вёсцы ёсць?

— Няма. Аўталаўка прыязджае два разы на тыдзень. А так па прадукты мы ездзім у Брэсцкую вобласць, у вёску Юндзілы. Яна побач, за два кіламетры. Але там у крамах усяго хапае. Нібы гэта не Беларусь, а іншая дзяржава. А ў нашых вясковых магазінах няма ніякага выбару. І, здаецца, адна дзяржава, — далучаецца да размовы і Лізавета Канстанцінаўна.

Калі мы пакідалі хату Андрайчукоў, падумалася: буду на Беласточчыне, абавязкова заеду ў Сямятычы і завязу паклон з Мізгіроў ад стогадовай вясковай жанчыны Веры Дзмітрыеўны.

Сяргей Чыгрын

На каго абурацца?

У артыкуле Анатоля Маўчуна „Эх, беларусы, усім вы ўпоперак..." („Ніва" н-р 5) ёсць такая цытата: „В. Сакоўскі піша, што беларусы павінны абурацца... На каго? На гісторыю, ці тых хто яе не ведае? Праваслаўе прыйшло ў Беларусь з Візантыі. Гэта праўда. Але гэта было 1000 гадоў таму. Другі раз яно прыйшло з Масквы, пасля падзелу Польшчы. У Расіі ў тым часе здзейсніліся рэформы Нікана, якія былі прычынай „расколу" ў 1659 годзе".

На маю скромную думку беларусы павінны абурацца і на гісторыю, якая так пакрыўдзіла нас, і на тых, хто яе не ведае або прыкідваецца што не ведае.

Не ўсіх жа беларусаў удалося зрабіць уніятамі або каталікамі ў Рэчы Паспалітай. Многіх з іх не ўдалося зламаць і яны да канца асталіся пры сваёй веры. Такім астаўся, напрыклад, прыход у Бельску і ў Заблудаве, і ў многіх іншых мясцінах. Ці думаеце яны былі горшымі беларусамі ад тых, што сталі ўніятамі ці каталікамі?! І можна называць іх веру сабачай?! Да таго ж, усе ўніяты раней былі праваслаўнымі. Называнне праваслаўя сабачай верай раўназначнае пляванню сваім уніяцкім продкам у твар, што з'яўляецца немалым грахом...

Далей у артыкуле расказваецца аб жахах, якія тварыліся над праваслаўем Нікана і царом Пятром І у Расіі. І, канешне, многа ў гэтым праўды, і ніхто разумны не пахваліць гэтага... Чаму ж тады пры такой нагодзе (так для параўнання) не ўспамінаеце, якія жахі тварыліся над праваслаўем (тым яшчэ візантыйскім, а не маскоўскім) і праваслаўным народам у Рэчы Паспалітай яшчэ да яе падзелу? Трэба тут адкрыта сказаць: прыдумалі нейкі гібрыд і сілай навязалі яго беларускаму народу, але ў правах не зраўнялі ўніятаў з каталікамі. І цар, і Нікан тут якраз ні пры чым...

Крытыкуецца нядобры Сямашка, але ні слова пра такіх жа нядобрых „сямашкаў" з другога боку. А было ж іх і там нямала. Некаторыя нават сталі святымі... Зло, як бы яго не круціў, заўсёды астаецца злом і трэба пра гэта аб'ектыўна гаварыць.

На самай справе, у Рэчы Паспалітай не давалі спакою праваслаўным, пакуль яны не ставаліся каталікамі ці хаця б уніятамі, а ў Расіі не давалі спакою беларусам-уніятам і каталікам, пакуль яны не ставаліся праваслаўнымі. І адны, і другія рабілі гэта і падобнымі спосабамі, і дзеля падобных мэт. Не лічыліся, адным словам, каралі і цары з беларусамі і іх святасцямі. Інакш кажучы, тое, што рабілі нашы хрысціянскія суседзі ў Беларусі і з беларусамі — гэта горкая насмешка над хрысціянствам.

Зважце яшчэ і тое, што Хрыстовае і Апостальскае хрысціянства даволі талерантнае. Яно ўмее выбачаць і памылкі, і зло, але, канешне, не кожнае. Да невыбачальнага граху — паводле хрысціянскіх законаў — залічаецца менавіта выкарыстоўванне рэлігіі для сваіх асабістых і палітычных мэт. Ісус Хрыстос выбачае апосталу Пятру, які ў цяжкіх хвілінах ад Яго адрокся, выбачае распусніцы, ратуючы яе ад укаменавання, і нават ліхадзею, але ніколі не выбачае фарысеям, якія выкарыстоўвалі рэлігію ў асабістых і палітычных мэтах, бо сапраўднае хрысціянства нічога супольнага з палітыкай не мела. І не мае.

Вось таму навязанне беларусам рэлігійнай уніі ў 1596 годзе і спосаб яе ліквідацыі ў 1839 — я, патомак былых уніятаў і сын ужо праваслаўных бацькоў — лічу чорнымі датамі і актамі насілля і гвалту, грубага таптання асноўнага і элементарнага іх нацыянальнага і агульначалавечага права — волі сумлення і веравызнання. Дзе не гарантуецца гэтае права — там нельга гаварыць аб талерантнасці...

Калі б, аднак, параўнаць гэтыя два гвалты, дык бясспрэчна, навязанне ўніі было большым гвалтам, чым яе ліквідацыя. Хаця б таму, што той гвалт быў першым. Не было б першага, не магло б быць і другога. Так ужо ёсць на гэтым свеце, што пачатае зло, як і дабро, далей толькі множыцца.

Найбольшае аднак і невыбачальнае зло ўніі заключаецца ў тым, што праз яе свядома быў дадзены пачатак падзелу нашага, па натуры сваёй добрага і спакойнага, народа на тры ўзаемаварожыя свядомасці: праваслаўную, уніяцкую і каталіцкую, з ліквідацыяй якога беларусы справіцца і па сёння не могуць. Змянілася і змяняюцца толькі колькасныя прапорцыі паміж гэтымі канфесіямі, не гаворачы ўжо пра мора пралітых слёз, крыві і цэлай арміі рэлігійных мучанікаў. З усіх бакоў, канешне.

А колькі ж Беларусь і наша мясцовасць праз гэтыя ж камбінацыі страцілі свайго нацыянальнага патэнцыялу?!

З рэлігійнага пункту гледжання ўнія таксама зло, бо з дзвюх канфесій паўстала не адна, а тры — як было ўжо сказана — узаемаварожыя і ваюючыя адна з другой, і як быццам забылі, што дзяленне Дому Божага заўсёды з'яўляецца грахом, а замена сілай адной хрысціянскай канфесіі другой — амаральным дзеяннем, нязгодным з духам хрысціянства.

Царкоўная ўнія была шкоднай не толькі беларусам і ўкраінцам. Моцна зашкодзіла яна і самой Польшчы, прычыняючыся ў немалой ступені да яе гібелі. Меў рацыю выдатны польскі гісторык і пісьменнік Павел Ясяніца, называючы ўвядзенне царкоўнай уніі вар'яцтвам. Так што не варта бараніць ні аднаго, ні другога...

Васіль Сакоўскі

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2006 r. upływa 5 marca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Выспа культуры Гарадок

Гімназія ў Гарадку не першы раз ужо запрасіла на „Сустрэчы культур", праект рэалізаваны ў рамках „Роўных шанцаў". Гарадоцкі школьны комплекс, дзякуючы перш за ўсё настаўнікам, якія з сэрцам бяруцца за развіццё роднай культуры, бурліць ідэямі і спраўным іх ажыццяўленнем. Да рэалізацыі далучаюцца дзеці і іх бацькі, не астаюцца халоднымі і ўлады ды спонсары. Проста, паяўляюцца асобы, якія арганізацыйнай спраўнасцю ды ўласным энтузіязмам, які запальвае іншых, разварушваюць атачэнне, у якім нядаўна „жыць нікому не хацелася". І свецяць прыкладам яны самі і іх сем'і. У гарадоцкай школе гэта перш за ўсё настаўнікі Аляксандр Карпюк і Ірэна Налівайка, якія разам з калегамі давялі да таго, што гарадоцкая школа становіцца адметнай па сваім характары. Члены школьнай грамады хочуць адразу весці госця пахваліцца Беларускай хатай, што размясцілася ў будынку, сустракаюць на мерапрыемствах, арганізаваных школай пры падтрымцы ўсяго мястэчка, старажытнага горада Гарадка. Адным з мерапрыемстваў, за якое варта пахваліць гарадоцкую гімназію, з'яўляюцца якраз „Сустрэчы культур".

„Сустрэчы культур" праводзіліся якраз у святочны дзень — на Стрэчанне Гасподняе, іначай Грамніцы. Звярнуў на гэта ўвагу айцец Мікола Астапчук, які вельмі паэтычна і патрыятычна выказаў падагульняючае слова наконт важнасці „ўвядзення" ў храм роднай культуры кожнага члена супольнасці. Спасылаючыся на Святое Пісанне, бацюшка прыгадаў яўрэйскую традыцыю аддання першынца ў Божую службу, як Ісуса, што было працягам прэзентацыі яўрэйскай культуры. Вучні Ірэны Матысюк падрыхтавалі паэтычнае выступленне з яўрэйскімі вершамі, а пра яўрэйскую культуру дэталёва расказаў прадстаўнік музея ў Тыкоціне спадар Маціяеўскі; у Гарадку да II сусветнай вайны яўрэі складалі 70% ад агульнай колькасці насельніцтва. Вучні, падрыхтаваныя настаўніцай Галінай Мельнік (украінкай), выступілі з прадстаўленнем украінскіх свят і абрадаў ды праспявалі некалькі народных песень, вельмі папулярных на Беласточчыне, якія ўспрымаюцца проста як свае. Вельмі прыгожа выступілі таксама дзеці і моладзь з курпёўскай гміны Збуйна — збуйненскія госці ахвотна прыязджаюць на ўсе гарадоцкія мерапрыемствы, м.інш. на „Сяброўскую бяседу". З растанцаванымі вучнямі прыехала сама пані дырэктар, якая разам з імі выступіла на сцэне. Малым курпікам была цікавая беларуская культура, гаспадарская, з якой, пры падтрымцы і кансультацыі старэйшых сяброўак з „Расспяванага Гарадка" ды Янкі Карповіча, выступілі гарадоцкія вучні. Аляксандра Карпюк адважным „белым" голасам праспявала жніўныя песні, з дваюраднай сястрой Габрысяй Налівайкай праспявалі калядкі, вучаніцы Яна Карповіча Івона Карповіч і Эвеліна Вакулеўская пры акампанеменце гітар — беларускія песні, чыталіся таксама вершы Адама Міцкевіча, як скарб не адной культуры. І выступленне „Расспяванага Гарадка", які зварухнуў маладое пакаленне. На заканчэнне культурнай бяседы адбыўся пачастунак. Смакоце — нацыянальныя і рэгіянальныя стравы падрыхтавалі настаўніцы і іх сябры. Былі цымус, селядцы, яйкі пакурпёўску, тушаная капуста, галушкі з мясам, „аб'ядзенне казака", варэнікі з баравікамі, шмальчык...

Міра Лукша

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

16 – Дзень Салідарнасці

Каля зубра ў парку, побач гарадскога магістрата ў Гайнаўцы, 16 лютага сабралася моладзь і некалькі дарослых асоб, каб прадэманстраваць сваю салідарнасць з загінуўшымі ў Беларусі палітыкамі і іх сем'ямі. Маладыя людзі побач помніка запалілі свечкі і лямпачкі, паклалі партрэты загінуўшых ды спявалі пад гітару беларускія песні. У руках сабраныя трымалі плакаты з лозунгамі „Вольная Беларусь". Заявілі яны, што невыпадкова сустракаюцца каля помніка зубру. У такі спосаб пратэстуюць яны супраць арыштам членаў згуртавання „Зубр", якія нядаўна адбыліся ў Беларусі. **(ам-з)**

* * *

У Познані ў чарговы раз адбыўся дзень салідарнасці, які суарганізавалі пяць арганізацый. Больш 50 сябраў гэтых арганізацый раздавалі мінакам значкі, джынсавыя стужкі, каляндарыкі Мілінкевіча і інфармацыю пра надыходзячыя выбары ў Беларусі. Пры вялікай прысутнасці сродкаў масавай інфармацыі было заяўлена, што 16 сакавіка акцыя салідарнасці будзе мець масавы характар.

Віталь Воранаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54	55	56	57	58		

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. змаганне = 6 _ 7 _ 32 _ 33 _ 46 _ 47 _ 44 _ 45 _;
2. джазавая музыка, якая адлюстроўвае лад і рытмы павольных лірычных песень афраамерыканцаў = 25 _ 26 _ 10 _ 34 _;
3. правабярэжны квартал Будапешта або першая частка назвы раённага цэнтра між Гомелем і Жлобінам = 56 _ 35 _ 15 _ 22 _;
4. валакністы матэрыял для медыцынскіх, бытавых або тэхнічных мэт = 50 _ 51 _ 18 _ 30 _;
5. муж бабы = 1 _ 2 _ 3 _ 43 _;
6. выгнутая частка вупражы, якая змацоўвае аглоблі з хамутом = 54 _ 55 _ 52 _ 53 _;
7. вязкі асадак мінеральных і арганічных рэчываў на дне вадаёма або самалёт Ільюшына = 27 _ 8 _;
8. яўрэйскія пасхальныя тонкія праснакі з пшанічнай мукі = 16 _ 17 _ 57 _ 58 _;
9. паслухмянае дзіця або ягоная цацка = 11 _ 14 _ 12 _ 13 _;
10. перыяд палавой актыўнасці ў самак млекакормячых = 40 _ 38 _ 19 _ 48 _ 49 _;
11. гіганцкія разбуральныя хвалі, якія ўзнікаюць на паверхні акіяна ў выніку падводнага землетрасення = 4 _ 9 _ 28 _ 42 _ 36 _ 5 _;
12. муж цыганкі = 29 _ 20 _ 23 _ 24 _ 37 _;
13. кітайская грашовая адзінка = 39 _ 31 _ 21 _ 41 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 3 нумара

Бюро, Дзяды, дым, імам, Лех, рыза, шум.

Рашэнне: **Харошым людзям і мы рады будзем.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Анне Дэмянюк** з Бельска-Падляшскага і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

26.02 – 04.03



Баран (20.03. — 19.04.) Будзеш думаць разважліва, спадзеючыся няхуткіх, але салідных карысцей. Знакаміты час падпісваць кантракты, дамовы. Нагоды дастаць немалыя грошы, нават выйграць у латарэю!

Бык (20.04. — 20.05.) Выберыся ў падарожжа, афармляй розныя справы, падцягні „хвасты". Да 27.02. асцерагайся ў сэрцовых гульнях. Можа захацець вярнуцца да цябе асоба, з якой ты даўно расстаўся, з-за якое было шмат болю; яна зусім не змянілася.

Блізняты (21.05. — 21.06.) У кампаніі і прафесіі ўсё ідзе знакаміта. Сустракайцеся з людзьмі, выбірайцеся ў файныя месцы з каханай асобай. Вашы жарсці разгарацца да белага! Можаце стаць ахвярай нячыстай гульні. Шэф ці хтосьці, хто не жадае вам дабра, спрабуе вамі маніпуляваць.

Рак (22.06. — 22.07.) Усё, за што возьмешся, прынясе табе задавальненне. Справы ідуць як па масле. Да 27.02. будзеш яшчэ раздражнены, поўны недаверу; не спрачайся з суседзямі. Вольныя Ракі маюць шанц спаткаць сваю палавінку, вельмі цікавую асобу, можа быць, чужаземца.

Леў (23.07. — 22.08.) Крыху менш энергіі, але не натужвайся, рабі ўсё памаленьку ды спраўна. Не абяцай зашмат сябрам, бо цяжка будзе здзейсніць абяцанае. Паправа адносін з блізкімі, благое забудзецца.

Дзева (23.08. — 22.09.) Вельмі ўдалыя сустрэчы, таксама і любоўныя. Добры час рабіць інтарэсы. 26-28.02. не патрабуй ад сябе і іншых зашмат. Можаш не разабрацца ў сітуацыі і ўпартае фарсіраванне свайго прынясе хутчэй шкоду.

Шалі (23.09. — 22.10.) Будзеце самі сябе шкадаваць, жаліцца на ўсё. Спакойна адчакайце гэты час. Справіцеся з клопатамі, якія нясе лёс. Прыязнае стаўленне да іншых прынясе вам сімпатыю і спрыянне іншых.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Пільнуйся, каб не ўцягнулі цябе ў нейкі круты інтарэс. Не дазволь, каб іншыя рашалі за цябе. Скарпіёны з 8-13.11. — вы пад апекай Юпітэра, які гарантуе поспех і шчасце ў пазбяганні клопатаў. Пагасіш сваю канфліктнасць.

Стралец (22.11. — 21.12.) Паафармляеш усе справы, дагаворышся з кім трэба, і настрой у цябе будзе знакаміты. Можаш пасябраваць з суседзямі, з якімі не жылося табе дагэтуль найлепш. Пільнуе цябе твой Анёл-ахоўнік.

Казярог (22.12. — 19.01.) Будзеш адказны і твае дзеянні прынясуць поспех. Будзеш цешыцца вынікамі тваёй працы, упартасці і сілы волі. Можаш стаць медыятарам у справе, якая цябе не датычыць.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Маеш магчымасць памагчы іншым. Пільнуй свайго здароўя. Можаш разлічваць на поспехі, асабліва ў фінансах. Новыя прыдатныя знаёмствы.

Рыбы (19.02. — 19.03.) Ваш нос да інтарэсаў можа давесці вас да поспеху. Усё пойдзе так як плануеце. Часам, каб быць адзін з адным бліжэй, варта пабыць ад сябе далей. Новы пачатак у прафесійных справах.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960